ЧИТАЛЬНЫЙ ЗАЛ БИБЛИОТЕКИ

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся! ... Proletarjaty wszystkich krajow, laczcie sie! ... Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЕЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
22 чэрвеня 1931 г.
№ 141 (3230)

Алма-Ата, Почтовая 81 Гос. публ. библ-ка Респ. Каз. ССР г. 125 — Т.

На рэвалюцыйным уздыме

Штодня тэлеграф прыносіць весткі аб упартых клясавых баёх у краінах капіталу. Пралетарыят і бядняцка-серадняцкія масы сялянства даведзены да поўнага руйнаваньня. Беспрацоўе, голад, нябачная галеча дасягнулі нябывалых разьмераў. Звыш 120 млн. працоўных у капіталістычных краінах засуджаны на голад. Сотні тысяч пухнуць з голаду. Эпідэмія, неадлучны спадарожнік голаду, косіць тысячы рабочых сем'яў, тысячы дзяцей, падлеткаў.

Голад пануе ня толькі сярод беспрацоўных, але і сярод тых рабочых, якіх яшчэ мускулы і сіла патрэбны для буржуазіі, якія яшчэ сёньня маюць работу. Капіталісты, пры дапамозе сацыял-інтэрвэнтаў, сыстэматычна зьніжаюць заработак, пагаршаюць умовы працы. Нават добра аплачваныя кваліфікаваныя рабочыя жывуць у прогаладзь. А пераважная большасьць рабочых, асноўная маса, рэдка бачаць кавалак хлеба.

Паход капітаўстаў і сацыял-фашыстаў на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас і зьніжэньне заработку сустракае рашучы адпор з боку пралетарыяту і працоўных мас. Магутная хваля забастовачнага руху расьце і пашыраецца. І што асабліва паказальна—кіраўніцтва забастовачным рухам вырываецца з рук сацыял-фашыстаў і рэфармісцкіх прафсаюзаў камуністамі. Камуністычная партыя і рэвалюцыйная прафарганізацыя ў кожным клясавым баі заваёўваюць новыя сотні тысяч рабочых, якія пакідаюць рады адраднікаў сацыял-фашыстаў і ідуць пад сьцяг рэвалюцыі, пад сьцяг камуністычнай партыі.

Упартая барацьба тэкстыльшчыкаў у Францыі, рашучае выступленьне гарнякоў на Гурным Шлёнску і салідарнае выступленьне рабочых трамвайшчыкаў Варшавы зьяўляюцца яскравейшымі прыкладамі гераічнай барацьбы пралетарыяту. У радзе прамысловых гарадоў Польшчы, Нямеччыны, Францыі, ПАЗШ нясупынна бастуюць сотні тысяч рабочых, адбіваюць атакі капіталістаў, пераходзяць самі ў контр-наступленьне.

Забастовачная хваля і масавыя выступленьні беспрацоўных пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі разрастаюцца. У Нямеччыне, у Польшчы, у ПАЗШ беспрацоўныя галодныя бяруць хлеб сілай. Кожны дзень газэты паведамляюць, што беспрацоўныя галодныя нападаюць на хлебапякарні і на спажывецкія крамы і дзеляць хлеб паміж сабой. З кожным днём усё больш упарта і ўсё больш рашуча беспрацоўныя даюць адпор паліцэйскай і сацыял-фашысцкай зграі, з кожным днём усё больш суровыя мэтады тэрору ўжывае буржуазія пры разгоне дэманстрацый беспрацоўных. Бомбы са слезагонными газамі, кулямёты, забойствы і калецтва—усё пушчана ў ход для прыдушэньня рэвалюцыйнага руху.

Аднак, ня гледзячы на дзікі тэрор, корсткую расправу буржуазіі, масавыя выступленьні пролетарыяту і асабліва беспрацоўных з кожным днём прымаюць усё большыя разьмеры. Няма ніводнага дня, каб беспрацоўныя не штурмавалі магістратаў, не разьбівалі спажывецкіх крам, не атакоўвалі паліцэйскіх вучасткаў. Досыць падаць толькі паасобныя факты выступленьняў беспрацоўных у Польшчы і Нямеччыне, каб убачыць наступальны характар баявых дэманстрацый беспрацоўных. «У Жырардове на працягу апошніх дзён ня спыняюцца баі беспрацоўных з паліцыяй. Беспрацоўныя, якіх атакавала конная паліцыя, хутка будавалі барыкады і ўмацаваўшыся ў іх, далі рашучы адпор паліцыі. Конная паліцыя некалькі разоў атакоўвала барыкаду і толькі пасьля прыбыцьця дапамогі ёй ледзь удалося выцясьніць рабочых. У Багунцы, прадмесьці Катавіц, беспрацоўныя сярод якіх было многа жанчын з дзецьмі на руках, прарваліся ў горад. Спробы паліцыі разагнаць беспрацоўных не далі вынікаў. Тады паліцыя пачала страляць. Беспрацоўныя адказвалі стрэламі і пачалі закідаць каменьнямі, вуглем, дошкамі, цэглямі. Каменьні і цэгла ляцелі з вокан рабочых кватэр. Пад націскам атаўпу паліцыя, адстрэльваючыся, прымушана была адступіць». Вось адзін з сотень фактаў, якія падае польскі фашысцкі друк.

Баявыя выступленьні беспрацоўных у Нямеччыне з кожным днём набываюць усё больш востры характар. Так, у Дартмундзе, ня гледзячы на напады паліцыі, адбылася бурная дэманстрацыя беспрацоўных, якія павыбівалі вокны, разбурылі рад спажывецкіх магазінаў. На розных вуліцах быў раскіданы брук, пабудаваны барыкады.

Такіх прыкладаў можна было-б прывесьці тысячы. Гэтыя прыклады сьведчаць аб тым, што пралетарыят і працоўныя масы, на якіх узвалены ўвесь цяжар эканамічнага крызісу, рашуча пераходзяць пад сьцяг рэвалюцыі і адзіны выхад з голаду і галечы бачаць у нізрынуньні ўлады буржуазіі і стварэньні савецкай улады.

Буржуазія мабілізавала ўвесь апарат для прыдушэньня рэвалюцыйнага руху, для прыдушэньня барацьбы беспрацоўных, якія дамагаюцца работы і хлеба. Аднак, з кожным днём гэтае прыдушэньне становіцца ўсё больш і больш цяжкім. Масавыя расстрэлы, арышты і катаваньні дэманстрантаў ня могуць прыпыніць, ня могуць затрымаць, ня могуць задушыць барацьбы пралетарыяту за ўладу, за хлеб, за работу. Тэрмины панаваньня ўлады рабаўласьнікаў - эксплёататараў скарачаюцца. Пралетарыят і працоўныя масы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі разгортваюць шырокае контрнаступленьне супроць дыктатуры фашызму—за дыктатуру пралетарыяту.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

Магутная хваля забастовачнага руху і баявых выступленьняў беспрацоўных узьнімаецца вышэй

Напярэдадні забастоўкі трамвайшчыкаў у Катавіцах

ВАРШАВА. 20-VI. У Катовіцах (Верхняя Сілезія) сярод трамвайшчыкаў пачаўся рух, які можа вылыцца ў забастоўку. Повад да канфлікту падала адміністрацыя, якая па даносу аднаго чыноўніка, зволіла некалькі рабочых.

У адказ на гэта трамвайшчыкі патрабавалі ад адміністрацыі безадкладна прыняць зволеных зноў на работу і зволіць даносчыка, пагражаючы ў працяўным выпадку забастоўкай.

«РАТАЎНІКІ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА ЛАДУ».

Масавыя скарачэньні дзяржаўных служачых у Польшчы

ВАРШАВА. 20-VI. Газэты паведамляюць аб мяркуемым скарачэньні значнай колькасьці дзяржаўных служачых і аб скасаваньні раду цэнтральных устаноў у мэтах «рэжыму эканоміі». Між іншым, мяркуецца ў бліжэйшым будучым скасаваць міністэрства земельных рэформ і грамадзкіх работ, пошт і тэлеграфу з перадачай іх функцый іншым міністэрствам.

«Рэжым эканоміі» будзе суправаджацца масавымі звальненьнямі дзяржаўных служачых. Ужо цяпер цыркулююць чуткі аб скарачэньні 30 проц. служачых дзяржаўнай манаполіі.

«Кур'ер Цодзённы» пацьвярджае, ня гледзячы на афіцыйнае абвяржэньне, аб скасаваньні 5 пэнраўнічных ваяводзтваў і каля 30 паветаў.

Масавыя аблавы і арышты сярод гарнякоў і трамвайных рабочых

ВАРШАВА, 20-6. У сувязі з апошнімі выступленьнямі беспрацоўных у Верхняй Сілезіі, палітычная паліцыя ўчыніла шматлікія арышты сярод рэвалюцыйных рабочых і беспрацоўных. Усяго арыштавана ў Верхняй Сілезіі, паводле вельмі нянпўных весткаў, за апошнія толькі дні звыш 100 чалавек. У Варшаве сярод трамвайшчыкаў учынены шматлікія арышты.

Падрыхтоўка да „цуда-вурны" ў Вэнгрыі на поўным ходзе

ВЕНА, 17. Увесь вэнгэрскі апазыцыйны друк падае факты адкрытага выбарчага тэрору ўлады супроць апазыцыйных кандыдатаў. Па загаду ўраду выбарчыя органы апублікавалі вялізарную колькасьць апазыцыйных кандыдацкіх сьпісаў. Забаронена ўсякая апазыцыйная перадвыбарчая агітацыя, канфіскуюцца здовсы і падлягаюць арышту апазыцыйныя кандыдаты і агітатары. У выбарчай акрузе Альшоленд-вай жандары зьбілі некалькі апазыцыйных актывістаў і заблі селяніна-бедняка Ёсіфа Пінтэра, які вёў агітацыю за кандыдата апазыцыйнай аграрнай партыі.

Супроць рэвалюцыйнага выбарчага блёку працоўных у Будапэшце ўвесь буржуазны друк, далучаючы і сацыдэмократаў вядуць шалёнае абгаварэньне. Некалькі агітатараў блёку зьбіты сацыял-фашыстамі.

Зьезд дэлегатаў бастуючых тэкстыльшчыкаў

ПРЫЖ, 20-6. Як паведамляе «Юманітэ», учора ў Алюена адбыўся скліканы Цэнтральным стачачным камітэтам і рэвалюцыйнымі прафсаюзамі зьезд дэлегатаў бастуючых тэкстыльшчыкаў. На зьезьдзе прысутнічалі 294 дэлегата, якія прадстаўлялі рабочых 116 прадпрыемстваў. Дэлегаты ірытыкавалі работу мясцовых стачачных камітэтаў і рашуча кляймілі здрадніцкія маноўры рэфармістаў, у тым ліку і бэльгійскіх, якія дзейнічалі ў раз рэз з баявымі настроямі бэльгійскіх тэкстыльшчыкаў. Дэлегаты падкрэсьлівалі рашучасьць бастуючых працягваць барацьбу да перамогі.

Прадстаўнік унутранага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў падкрэсьліў інтэрнацыянальнае значэньне стачкі і горача настойваў на неабходнасьці канчатковага вырваць кіраўніцтва з рук рэфармістаў. Спатканы бурнымі воплескамі тав. Фрашон цітаў зьезд ад імя французкай кампартыі. Тав. Фрашон заклікаў дэлегатаў да ўзмацненьня адзінага рабочага фронту, у сувязі з надыходзячымі буйнымі клясавымі бойкамі.

Рабочыя Бэрліну чытаюць плякат, прысьвечаны міжнароднаму дню салідарнасьці супроць фашысцкай рэакцыі.

Гандлёвыя ўзаемаадносіны паміж СССР і Італіяй пасьпяхова разьвіваюцца

МАСКВА. 20-VI. 20-га чэрвеня Усесаюзная заходняя гандлёвая палата наладзіла прыём з прычыны прабываньня ў Маскве італьянскай прамысловай дэлегацыі. На прыёме прысутнічалі італьянскі пасол у СССР пан Аттоліко, італьянская дэлегацыя ў поўным складзе, чыны італьянскага пасольства, нам. наркома замежных спраў, член прэзыдыуму Усесаюзнай заходняй гандлёвай палаты, загадчык трэцім заходнім аддзелам НК замежных спраў тав. Рубінін, кіраўнікі гаспадарчымі арганізацыямі і адказныя супрацоўнікі НК замежных спраў і Усесаюзнай заходняй гандлёвай палаты.

Тав. Бэге вітаў дэлегацыю ад імя савецкай гандлёвай грамадзкасьці і зазначыў, што палата, шляхам узмацненьня інфармацыі аб італьянскай эканоміцы ў ССР і аб савецкай эканоміцы ў Італіі, імкнецца садзейнічаць узмацненьню эканомічных адносін, якія пасьпяхова разьвіваюцца паміж абедзьвюма краінамі. Рост таваразвароту паміж імі сьведчыць, што шляхі эканамічнага руху пройдзены правільна.

Прафэсар Гуарнэры выказаў ад імя дэлегацыі падзяку за шчыры прыём і зазначыў, што дэлегацыя ўжо пасьпела агледзіць рад маскоўскіх прадпрыемстваў. Члены дэлегацыі зараз ўжо ўяўляюць сабе тыя вялікія посьпехі, якія дасягнула маладая савецкая краіна. Эканамічны рост Савецкага саюзу, аднак, не павінен выклікаць непакой у іншых краінах, таму, што ён бязумоўна павяе за сабой рост таваразвароту паміж СССР і іншымі краінамі, што эразумелая рэч, у інтарэсах апошніх.

У заключэньне праф. Гуарнэры выказаў упэўненасьць, што ўзаемаадносіны паміж СССР. і Італіяй будуць пасьпяхова разьвівацца і ў далейшым. Затым госьці агледзілі экспортны музэй. Учора ўвечары ўся дэлегацыя выехала ў Ніжні Ноўгарад для агляду пабудоў.

Да ведама рабкораў прыгарадных гаспадарак МЦРК

Рэдакцыі газэт «Савецкая Беларусь», «Сельска-гаспадарчы Рабочы Беларусі» і ЦП саюзу працаўнікоў гандлю і кааперацыі 25 чэрвеня а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь» (Менск, пляц Волі, 17)

СКЛІКАЮЦЬ

НАРАДУ РАБКОРАЎ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК ПА ПЫТАНЬНІ АБГАВАРЭНЬНЯ ПРАЭКТУ ТЭЗІСАЎ ДА РАБСЕЛЬКОРАЎСКАГА ЗЬЕЗДУ АБ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ.

На нараду, акрамя рабкораў, павінны зьявіцца кіраўнікі (альбо іх намесьнікі) саўгасаў, кааперацыйны актыў, ударнікі прылаўка (работнікі крам абслугоўваючых саўгасы).

Просьба на нараду зьявіцца без опазьненьня.

Рэдакцыя газ. «Савецкая Беларусь».
Рэдакцыя газ. «Сельскагаспадарчы Рабочы Беларусі».
ЦП саюзу працаўнікоў гандлю і кааперацыі.

Па-бальшавіцку рэалізуем рашэньні чэрвеньскага пленуму ЦК ЎсеКП(б)

Рэзалюцыя сходу мен. гар. актыву КП(б)Б па дакладу тав. ГЕЯ аб выніках чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б)

Заслухаўшы (даклад (сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гея аб выніках чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б), актыў менскай гарадзкой партыйнай арганізацыі поўнасьцю ўхваляе і далучаецца да пастаноў пленуму.

1. Актыў канстатуе, што ў той час, як капіталістычны сьвет перажывае нясьпрымнае паглыбленьне крызісу, Савецкі Саюз, на аснове ленінскай лініі партыі, няўхільна ідзе па шляху эканамічнага і культурнага росту, уздыму, па шляху росквіту прадукцыйных сіл краіны. Папярэднія вынікі веснавой сяўбы, падведзеныя пленумам ЦК УсеКП(б), з поўнай відавочнасьцю гавораць аб тым, што рабочай клясай, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі дасягнуты на вучастку калгаснага будаўніцтва новыя буйныя перамогі. У калгасах аб'ядналася 53,7 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у асноўных збожжавых раёнах калектывізацыя завершана. Такім чынам тэмпы калектывізацыі, намечаныя пастановай ЦК УсеКП(б) ад 5-1-1930 г., пастановамі XVI партзьезду і VI зьезду Саветаў—перавышаны. Выкананьне на 10 чэрвеня 90 проц. пасеўнага пляну ўжо азначае перавышэньне мінулагодняга яравога кліну. Са значным перавыкананьнем мінулагодніх плянаў ідзе сяўба тэхнічных і гародных культур. Важнейшае значэньне набывае той факт, што калгаснае сялянства ператварыцца ў цэнтральную фігуру земляробства, у асноўнага прадуктара на тольгі збожжа, але і важнейшага сельскагаспадарчага сьырцу.

БССР, як неаддучная частка Савецкага Саюзу, на фронце калектывізацыі і веснавой сяўбы мае таксама буйныя посьпехі. Тэмпы калектывізацыі, намечаныя студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б, перавышаны. На 10 чэрвеня калгасы ядналі 34,2 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Калгасны сэктар пераможна перавыканаў плян сяўбы тэхнічных культур. З гонарам справіліся са сваімі задачамі 27 МТС, якія працуюць у БССР і якія ўжо перавыканалі як агульныя пасеўныя планы, так і заданьні па тэхнічных культурах. Выкананы пляны гародняй сяўбы па прыгарадных гаспадарках.

Але поўная перамога на пасеўным фронце да сёньняшняга дня яшчэ не завершана. Агульны пасеўны плян выкананы толькі на 81,1 проц., мінулагодні клін яшчэ не перакрыт.

Па Менскім прыгарадным раёне так сама ёсьць значнае адставаньне ад пляну новых заданьняў. Плян сяўбы на 18 чэрвеня рэалізован толькі на 67 проц. Адстаюць саўгасы (69,8 проц.). Асабліва адстае аднаасобны сэктар, які за сеяў толькі 67,4 проц. намечанага яравога кліну.

Партактыў заклікае ўсю Менскую партыйную арганізацыю мабілізаваць сваю ўвагу на ліквідацыю прарыву, на бязумоўнае выкананьне пасеўных заданьняў па прыгарадным раёне.

Менскі партактыў заклікае ўсе арганізацыі КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) намагчы ўсе свае сілы, усю волю, усю энэргію па забесьпячэньне рашучага пералому ў тэмпах сяўбы, на 100-процантнае выкананьне пляцавых заданьняў, на пераможнае завяршэньне веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі. Актыў адзначае, што недасеў у радзе выпадкаў тлумачыцца моцным адставаньнем індывідуальнага сэктару (75,4 проц. пляну), што ў пэўнай ступені зьяўляецца рэзультатам праяўленьня апартуністычнай недаацэнкі з боку некаторых раённых арганізацый вытворчай ролі аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, рэзультатам слабай арганізацыйнай масавай работы ў вёсцы.

Канцэнтруючы сваю ўвагу на хутчэйшым і поўным сканчэньні засеву яравога кліну, менская арганізацыя і ўся КП(б)Б павінна ўжо зараз разгарнуць па ўсім фронце падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі, якая заклікана за вярэшць посьпехі веснавой сяўбы, рушыць уперад усю справу сацыялістычнай рэконструкцыі сельск. гаспадаркі.

Актыў адзначае, што ў справе пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі рашаючае значэньне набывае праблемы поўнага ўкараненьня прынцыпу зьдзельшчыны ў калгасах, саўгасах і МТС, праблема поўнай ліквідацыі абязьлічкі, праблема размеркаваньня даходаў па колькасьці і якасьці працы на аснове прасьцейшага, даступнага разуменьня кожнага калгасьніка ўліку працадзён, выразнай расстаноўкі ўсіх наяўных сіл.

Перад прамысловасьцю БССР стаіць адказьнейшая задача поўнага выкананьня заданьняў па вырабе ўборачных машын, іх рамонце, вырабу запасных частак, задача рашучага паляпшэньня якасьці прадукцыі, барацьбы з бракам. Асабліва адказныя задачы ў гэтых адносінах стаяць перад гомельскім Сельмашам і Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінатам.

Актыў падкрэсьлівае, што поўнае выкананьне плянаў сяўбы і ўсіх мерапрыемстваў, намечаных пастановай пленуму ЦК УсеКП(б) зьяўляецца базавой задачай кожнага камуніста, кожнай ячэйкі, усёй Менскай арганізацыі, усёй КП(б)Б у цэлым і сюды павінен быць накіраван цэнтр усеагульнай увагі.

2. Чыгуначны транспарт на аснове ажыцьцяўленьня пастаноў партыі і ўраду дасягнуў ужо бясспрэчных буйных посьпехаў. Па выкананай грузавой рабоце чыгуначны транспарт СССР заняў другое месца ў сьвеце, пасьля ПАЗШ. Аднак, тэмпы разьвіцьця транспарту яшчэ адстаюць ад патрабаваньняў сацыялістычнага будаўніцтва і чыгунка ўсё яшчэ зьяўляецца вузкім месцам народнай гаспадаркі.

Партактыў цалкам ухваляючы мерапрыемствы, вызначаныя пленумам ЦК УсеКП(б) у галіне рэканструкцыі і далейшага разьвіцьця сацыялістычнага транспарту, заклікае чыгуначныя і ўсе партыйныя арганізацыі забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых Цэнтральным Камітэтам на гэтым важнейшым вучастку работы, Асабліва важнае значэньне актыў надае поўнай ліквідацыі абязьлічкі, поўнаму пераходу на спарную язду, ад чаго ў вялікай ступені залежыць аздараўленьне ўсёй транспартнай гаспадаркі.

Як бліжэйшую практычную задачу, што стаіць перад транспартам, партыйнымі, прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі, партактыў падкрэсьлівае поўную падрыхтоўку да асеньня-зімовых перавозак. Актыў канстатуе, што ў гэтай галіне як з боку цэнтральных, так і мясцовых арганізацый БССР, зроблена яшчэ вельмі мала, што падрыхтоўка фактычна яшчэ не пачата.

Актыў абавязвае чыгуначныя партячэйкі і чарткалектывы неадкладна разгарнуць практычную работу па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з асеньня-зімовымі перавозкамі і заклікае ўсе партарганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў асеньня-зімовых перавозак.

3. Праблема разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі, пастаўленая ва ўсю шырыню ў пастанове пленуму ЦК УсеКП(б), набывае для Менску, як і для ўсёй БССР, выключна важнае гаспадарча-палітычнае значэньне ў сувязі з тым, што многія гарады БССР вельмі пацярпелі ў годы імпэрыялістычнай вайны і капіталістычнай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Партыя і ўрад забясьпечылі вялізарнейшыя посьпехі ў справе разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі БССР і, у прыватнасьці, гор. Менску. Перад рабочымі масамі Менску, перад менскай партарганізацыяй стаяць адказьнейшыя задачы па ўздыме і разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі Менску на падставе практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў пленуму ЦК УсеКП(б).

Двухдэкаднік па дабрабыту і санітарнай ачыстцы гораду зьяўляецца толькі першым элемэнтарным крокам палепшаньня дабрабыту гораду.

Актыў заклікае ўсю партарганізацыю намагчы ўсе свае сілы на поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў сакавіцкага пленуму гаркому аб пляне разьвіцьця камунальнай гаспадаркі ў 1931 г., які намеціў практычныя шляхі барацьбы за правядзеньне ў жыцьцё задач партыі ў галіне ўздыму камунальнай гаспадаркі.

Менскі партактыў лічыць неабходным усямернае фарсаваньне тэмпаў далейшага разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі Менску і іншых гарадоў БССР, што забясьпечвае палепшаньне дабрабыту шырокіх мас рабочых і прапоўных.

У прыватнасьці партактыў лічыць важнейшай задачай сеньняшняга дня зьмякчэньне ў Менску жыльлёвага крызісу шляхам узмоцненага разьвіцьця жыльлёвага будаўніцтва, пашырэньня энэргэтычнай базы для менскай прамысловасьці, у сувязі з тым, што Эльвод з цяперашняга моманту ўжо не спраўляецца з усімі патрабаваньнямі, якія яму прад'яўляюцца, на электраэнэргію, карэнную рэканструкцыю водаправоду, пашырэньне сеткі дзьвяў і пральняў, паскарэньне пабудовы аўтаматычнай тэлефоннай сеткі паляпшэньне гарадзкога транспарту, павялічэньне сацыяльна-бытавых устаноў, паляпшэньня санітарнага стану гораду.

Актыў зьвяртае асаблівую ўвагу партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый на бявую задачу барацьбы за ачад, за бязумоўнае забесьпячэньне апалам прамысловасьці, дзяржаўных, культурна-бытавых устаноў і прапоўнага насельніцтва. Фарсаваньне здабычы торфу ,поўная рэалізацыя загатоўкі і вывазкі торфу павінны прыцягнуць да сябе увагу ўсёй партарганізацыі.

4. Пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) намецілі асноўныя чарговыя зьвены работы партыі і далі базавую праграму дзеяньняў па будаўніцтве сацыялізму. Гэтыя пастановы павінны ўзброіць партыйныя масы на далейшую барацьбу за ператварэньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, на бязьлітасную барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, і «левымі» загібамі.

Актыў заклікае ўсю партарганізацыю мабілізаваць ініцыятыву і энэргію рабочае клясы і ўсіх працоўных на выкананьне пастаноў пленуму. Гэтым мы забясьпечым новыя перамогі ў справе індустрыялізацыі краіны, далейшага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва, ажыцьцяўленьне лёзунгу ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі, завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

30-га чэрвеня ўсебеларускі зьезд рабселькораў

ПАДЦЯГНУЦЦА АДСТАЮЧЫМ РАЕНАМ

РАБСЕЛЬКОРЫ Случчыны, Капыльшчыны, Бабруйшчыны, Барысаўшчыны, Заслаўшчыны — ПРЫМАЙЦЕ

ЗАКЛІК РАБСЕЛЬКОРАЎ КОЙДАНАЎСКАГА РАЁНУ

Бярэзінскі і Крупскі раёны не забясьпечылі баявой падрыхтоўкі да зьезду

Рабочыя, калгасьнікі! Беднякі і серадняки. Арганізуйце прапрацоўку праэктаў-тэзісаў. Дасылайце свае прапановы і заўвагі аб тэзісах да рабселькораўскага зьезду

Маюць слова рабселькоры Койданаўшчыны

КОЙДАНАВА, 21-6. Трэці раённы зьлёт рабселькораў Койданаўшчыны абгаварыў праэкт тэзісаў аб задачах рабселькораў у справе вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі цалкам адобрыў іх і ўносіць свае наступныя дадаткі і прапановы.

1. Да пункту 5 трэба дадаць: арганізаваць у кожным саўгасе і калгасе гурткі па вывучэньні тэхнікі жывёлагадоўлі, а таксама вячэрнія курсы для падрыхтоўкі рабочых і калгасьнікаў у тэхнікумы і ВНУ, для чаго скарыстаць мясцовых спэцыялістаў і настаўнікаў.

2. Да пункту 6 трэба дадаць: Усебеларускі зьезд рабселькораў па вінен вызначыць неабходную колькасьць спэцыялістаў па жывёлагадоўлі для БССР і тэрміны іх падрыхтоўкі пад кутом погляду ўдзелу ў гэтай справе рабселькораў.

3. Да пункту 9 трэба дадаць слова «і свячасовае». Такім чынам гэты пункт з другога абзацу трэба чытаць так:

«У гэтай справе перад рабселькорамі жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў стаяць задачы: барацьба за палепшаньне стада рагатае жывёлы, за падвышэньне яе прадукцыйнасьці і таварнасьці, за поўнае і свячасовае выкананьне заданьняў ураду ад здачы малака і мяса пралетарскім цэнтрам...» і г. д.

4. Да пункту 11 трэба дадаць: рабкоры павінны змагацца за пашырэньне будаўніцтва ў саўгасах і калгасах, за зьніжэньне сабекошту будаўніцтва.

5. Акрамя гэтага зьлёт уносіць у тэзісы новыя 4 пункты наступнага зьместу:

1) Кожны рабселькор павінен быць ініцыятарам разьвіцьця птушніцтва і кролікаводзтва, якія маюць вялізарнае значэньне ў справе вырашэньня мясной праблемы.

2) У мэтах арганізацыі абмену вопытам жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў увесьці сыстэму правядзеньня экскурсый ударнікаў саўгасаў СССР.

3) У справе вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі на долю кіно прыпадае вялікая частка работы, а таму Беддзяржкіно павінна зарасжа прыступіць да выпрацоўкі кінофільм па жывёлагадоўлі.

4) Кожны рабселькор павінен змагацца за забясьпячэньне саўгасаў і калгасаў неабходнымі машынамі для першапачатковай перапрацоўкі прадуктаў жывёлагадоўлі.

Рабселькоры Койданаўшчыны бяруць на сябе абавязак неадкладна разгарнуць шырокую работу па папулярызацыі праэктаў тэзісаў да рабселькораўскага зьезду сярод рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас.

Зьлёт рабселькораў Койданаўшчыны выклікае рабселькораў Случчыны, Капыльшчыны, Бабруйшчыны, Сьмілаўшчыны, Заслаўшчыны, Барысаўшчыны на сацспаборніцтва на лепшае абгаварэньне тэзісаў да зьезду.

Дубіцкі.

Умацаваць насьценгазэту

(Ад нашага бабруйскага кар.).

У саўгасе Жылічы ёсьць усе ўмовы для шырокага разгортваньня работы з рабселькорамі і работы насьценнай газэты. Адсутнічае толькі адна асноўная ўмова — належнае штодзённае кіраўніцтва насьценнай газэтай і рабселькораўскай работай з боку партыйнай ячэйкі саўгасу, дапамога з боку прафарганізацыі і тых культурных сіл, якія ў саўгасе ёсьць (2 школы, практыканты - студэнты, настаўніцтва).

Газэта цягне нікчэмнае існаваньне. Яна зусім ізалявана ад работы саўгасу. Знаходзіцца яна надзе за паўкілёмэтра ад цэнтру саўгаснага жыцьця, прычым пакой, у якім знаходзіцца газэта, у большасьці замкнуты.

Апошнія перавыбары рэдкалегіі не скарыстаны для ўзмацненьня работы насьценгазэты, не ператвораны ў масавую палітычную кампанію. Пасьля перавыбараў рэдкалегія не разгарнула, не ўзмацніла работы, асобныя члены рэдкалегіі нават ня ведаюць аб сваім абраньні.

На старонках насьценнай газэты, (якая выйшла з кастрычніка месяца ўсяго тры разы) зусім няма самакрытыкі, насьценгазэта ня стала на чале барацьбы за пасьпяховае сканчэньне сяўбы. Сярод асобных актывістаў (член рабачкому Навіцкі) існуе шкодная думка аб непатрэбнасьці самакрытыкі. Ён на сходзе рабочых раіць «пісаць у насьценгазэту такія заметкі, якія нікога ня б'юць».

Адсутнічае кіраўніцтва насьценгазэтай і з боку раённай газэты. У выніку, насьценгазэта саўгасу не карыстаецца аўтарытэтам, рабкораўскі рух і самакрытыка разгорнуты вельмі слаба. Такое становішча не павінна застацца на далейшы час. Партыйная ячэйка саўгасу павінна паставіць у ася родак сваёй увагі работу насьценнай газэты. Прафарганізацыя павінна наладзіць сваю дапамогу насьценгазэце і арганізаваць тэтую дапамогу з боку маючыхся ў саўгасе школ і настаўніцтва.

У сваю чаргу рэдкалегія раённай газэты павінна выслаць у саўгас свайго інструктара для наладжваньня рабселькораўскай работы і работы насьценгазэты. Гэтыя мерапрыемствы забясьпечаць узьнаўленьне насьценгазэты саўгасу на належную палітычную вышыню, забясьпечаць разгортваньне самакрытыкі і рабселькораўскага руху.

Д. Аланскі.

Падрыхтоўка да зьезду не разгорнута

Падрыхтоўка да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў увайшла ў другую рашаючую стадыю свайго разгортваньня. Зараз уся ўвага павінна быць згуртавана на замацаваньні дасягнутых посьпехаў у справе перабудовы рабселькораўскага руху тварам да сацыялістычнага будаўніцтва, на абгаварэньні праэктаў тэзісаў аб ралі рабселькораў і нізавога друку па асобных найадказьнейшых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэтага няма ў Бярэзінскім раёне.

Бярэзінская пратарганізацыя ня кіруе рабселькораўскім рухам і нізавым друкам, не зьвярнула належнае ўвагі на гэтую работу.

З пачатку чэрвеня, адбылася раённая нарада рабселькораў. На гэтую нараду зьявілася 17 чал. рабселькораў, а фактычна прысутнічала 10 чал. Пытаньне аб усебеларускім рабселькораўскім зьездам на было ўключана ў парадак дня нарады. Партыйная і камсамольская ячэйкі не зьвярнулі за падрыхтоўку да зьезду ніякай увагі Адсутнічае сталы вучот рабселькораў.

Насьценгазэты якія выдаюцца па сельскіх саветах не адбіваюць сучаснага жыцьця на сваіх старонках. Газэты не вядуць ніякай барацьбы з кулацкімі элемэнтамі, слаба асьвятляюць ход веснавой сяўбы. Есьць выпадкі, калі ў некаторых калгасах, (асабліва ў калгасе «Інтэрнацыянал»), маюцца прарывы па веснавой сяўбе, насьценгазэта аб гэтым не сказала ні слова.

Трэба неадкладна ліквідаваць недахопы ў падрыхтоўцы да зьезду. Бярэзінская партарганізацыя павінна гэтую падрыхтоўку забясьпечыць.

З. В.

Рабкоры Крупскага раёну вышлі ў рэйд

КРУПКІ (па тэлеф. ад наш. кар.) Крупскія рабселькоры ўключаюцца ў рэйд ударных брыгад газэт «ЗКП» і «Сав. Бел.» Арганізавана камсамольская ўдарная брыгада друку.

Райміскком саюзу працасьветы прад'явіў рахункі арганізацыям, установам і працоўнай грамадзкасьці па падрыхтоўцы да новага навучальнага году, па разгортваньні культработы. Брыгады вышлі ў рэйд.

А. Букінік.

Да ўдарнікаў друку гор. Менску, ДЭПУТАТАЎ і ЧЛЕНАЎ СЭКЦЫІ МЕНГАРСАВЕТУ

Рэдакцыя газэт «Савецкая Беларусь», «Рабочий» і «Акцябр» праводзяць 24, 25 і 26-VI АБ'ЯДНАНЫ ГАРАДЗКІ РЭЙД УДАРНІКАЎ ДРУКУ па ПРАВЕРЦЫ СТАНОВІШЧА КАМУННАЛЬНАЙ І ГАРАДЗКОЙ ГАСПАДАРКІ І ДАБРАБЫТУ МЕНСКУ.

23 чэрвеня ,а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Менгарсавету (пляц Волі) адбудзецца ІНСТРУКЦЫЙНАЯ НАРАДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ РЭЙДУ.

24, 25 і 26 чэрвеня ў рэдакцыях газэт «Савецкая Беларусь» (пляц Волі 17, будынак ЦВК) «Рабочий» (Савецкая), «Акцяб

ЗА ДВА ДНІ ЎДАРНАГА ДЭКАДНІКА

скончыць рэалізацыю пазыкі па гарадох. Перакінуць пазыку ў вёску

Заводы імя Варашылава, „Камунар“, „Чырвоная Зорка“, „Гомсельмаш“, „Камінтэрн“, імя Ланцуцкага, „Калектыўная Праца“ скончылі рэалізацыю пазыкі „3-га рашаючага“

ПЕРАМОЖЦЫ! НА БУКСІР АДСТАЮЧЫХ

На здымку: ударнік—токар заводу «Камунар» т. Піткевіч, які падпісаўся на 250 проц. месячнага заробку.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

рэалізацыі пазыкі „Трэцяга рашаючага“ сярод рабочых і служачых па 17 раёнах БССР на 20-VI—31 г.

Назва гораду	Сума падпіскі ў тыс. руб.	Процант выканання
1. Чэрвень	33	69,7
2. Гомель	2600	67,8
3. Бярэзіна	411	57,9
4. Ворша	550	57,7
5. Менск	2.200	49,9
6. Магілеў	611	40,2
7. Талачын	26	40,0
8. Круглае	9	34,7
9. Старобін	35	34,3
10. Жэрэвічы	9	31,0
11. Бягомль	12	30,0
12. Ветрына	15	29,4
13. Цер хоўка	11	24,4
14. Чавусы	10	17,9
15. Заслаўе	12	17,1
16. Сурж	28	11,4
17. Халопенічы	3	8,6

1) рад астатніх раёнаў зьвестак аб рэалізацыі пазыкі не даслаў, што дае падставу гаварыць пра адсутнасьць у іх усякай работы у гэтым напрамку.

2) Весткі ад паасобных прадпрыемстваў кажуць аб тым, што фінансава-крэдытны апарат адстае ад тэмпаў ходу самой падпіскі і дрэнна наладжвае вучот. Камсоды на паасобных прадпрыемствах не работаюць (Кастрычнік, Абутнік, Пралетары). Ёсьць выпадкі недастатковага поўнага ахопу падпіскай паасобных рабочых. Замест правядзеньня шырокай растлумачальнай работы, накіраванай на папулярызацыю пазыкі, і растлумачальнай літаратуры, падпісныя бляшкі выкідаюцца нават-дзе ў сьмяцьцёвую скрынку, (дрэваапрацоўчы завод «Камінтэрн», Барысаў).

Ня ведаюць пра пазыку

Сярод калгасьнікаў калгасу «Вольная Беларусь», Слуцкага раёну, зусім не праведзена ніякой растлумачальнай работы па падпісцы на пазыку «3-га рашаючага». Частка калгасьнікаў і нават членаў праўленьня калгасу ня ведаюць аб новай пазыцы. Неабходна адзначыць, што за гэтым колгасам яшчэ лічыцца запазычанасьць па пазыцы «Пяцігодка ў чатыры гады».

Трэба зараз-жа ліквідаваць прарыў у рэалізацыі пазыкі сярод калгасу «Вольная Беларусь».

Мазо.

Да 23 чэрвеня падпіска будзе скончана

Падпіска на пазыку «3-га рашаючага» сярод студэнтаў і настаўнікаў Менскага Беларэдтэхнікуму праходзіць з вялікім посьпехам.

Студэнты - стыпэндыяты падпісаліся на месячную стыпэндыю, што дасягнула да 9.000 руб.

Студэнты нестыпэндыяты таксама не адстаюць. Падпісалася больш 250 студэнтаў нестыпэндыятаў на 10—20 рублёў кожны.

Настаўнікі падпісаліся на месячны аклад.

Рэалізацыя пазыкі да 23-VI—будзе закончана.

А. З-кі.

Месячны заработак--на пазыку

Рабочыя і служачыя саўгасу імя Будзённага (Менскі прыгарадны сельсавет) і навуковыя працаўнікі Цэнтральнай бульбяной станцыі падпісаліся яна пазыку «3-га рашаючага» на месячны заработак. Значная частка рабочых і служачых падпісваюцца на пазыку на 125 проц. месячнага заробку.

Кантрольная лічба па рэалізацыі пазыкі выканана на 109 проц.

Усе астатнія саўгасы, бярэце прыклад з перадавых.

А. Заслаўскі.

Выклікаем на сацспаборніцтва

(Асіпавіцкі раён).

Заслухаўшы інфармацыю аб пазыцы «3-ці рашаючы год пяцігодкі», агульны сход членаў саюзу Лесдрэў, Вязскага цэхскому ў ліку 56 чалавек, адабрае заклік рабочых Ленінграду і іншых цэнтраў аб выпуску новай пазыкі, як магутнага фактару выканаўня «518» і «1040», падвядзеньня сацфуд даманту пад народную гаспадарку СССР.

Мы, рабочыя і служачыя, у ліку 56 чалавек падпісваемся ня менш, як на 3-х тыднёвы сярэдні заработак.

Адначасова выклікаем на сацспаборніцтва па правядзеньні рэалізацыі пазыкі Лапіцкі цэхком Асіпавіцкага РК.

Прэзыдыум сходу.

На пазыку „3-га рашаючага“

⊙ Калектыў служачых Клічаўскага РВК падпісаўся на пазыку «3-га рашаючага» на 3.060 руб. Большасьць служачых падпісалася звыш месячнага за работку на 15—20 проц. Падпіска працягваецца. Калектыў служачых выклікаў усе ўстановы і арганізацыі раёну пасьледаваць іх прыкладу.

Трэба адзначыць, што 4 асобы з калектыву ганебна плятуцца ў хвасьце па падпісцы(Секке, Доўгі, Чарнова і Юркевіч). Гэтым тт. неабходна падця гнуцца і раўняцца па ўсіх служачых калектыву РВК, якія падпісаліся на 100 проц. месячнага заработку і звыш.

Бегляко.

⊙ Настаўнікі і тэхнрацаўнікі 5 ФЗВ гор. Менску падпісаліся на пазыку на 100 проц. месячнага заработку і выклікалі ўсе школы гор. Менску пасьледаваць іх прыкладу.

⊙ Вучні Алёнаўскай ШМК і ВШК падпісаліся на пазыку трэцяга рашаючага на 3 руб. кожны. Яшчэ да абвяшчэньня дэкрэту ўраду аб выпуску пазыкі вучні ўнесьлі датэрмінова на пазыку 150 руб. Экскурсія вучняў на Асінбуд і Аршанскі камбінаты—мясны і лёнакамбінат — зьявілася лепшым штурхачом у справе рэалізацыі пазыкі сярод вучняў.

Вучні выклікалі ўсіх настаўнікаў Коханаўшчыны падпісацца на пазыку ня менш месячнага заработку.

Вучком.

⊙ Працаўнікі міліцыі і крым. вышуку Петрыкаўскага раёну падпісаліся на пазыку на 100 проц. месячнага заработку і выклікалі пасьледаваць іх прыкладу працаўнікоў міліцыі і крымвышуку ўсіх раёнаў былой Мазырскай акругі.

Рапарт

Сакратару ЦК КП(б)Б ГЕЮ, старшыні СНК Галадзеду і ЦО „Зьвязда“

Лепельская райпартарганізацыя пад кіраўніцтвам Лепельскага ЦК КП(б)Б, мабілізуючы працоўныя масы на выкананьне прамфінпляну трэцяга рашаючага году, у бязьлітаснай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі,—змагаючыся за высокія тэмпы калектывізацыі і выкананьне пляну веснавой сяўбы, дабілася рашучых перамог:

На 20-га чэрвеня 78,7 проц. бядняцка - серадняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы. Сустрэчны плян сяўбы ў 24.420 га выканан на 25.440 га, што складае 105,5 проц. Плян пасеву лёну і канапель у 4.451 га выканан на 5.146 га, альбо на 115,6 проц., бульбы, замест плянавых 5.125 га, засеяна 5.840 га, або 114,9 проц.

Перавыканаўшы плян веснавой сяўбы раён пераключыўся на ўдарную падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы. Высунут сустрэчны плян павялічэньня асеньняга кліну ў 500 га.

Партарганізацыя і саветы мабілізаваны на ліквідацыю прарываў па ўкараненьні зьдзельшчыны ў калгасах, па выкананьні плянаў і лесазагатовак, вывазкі каменьняў і па мабілізацыі сродкаў.

Запэўніваем, што мы будзем з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за высокія тэмпы і якасьць уборкі ўраджаю, шырока разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, за стварэньне кармовай базы, за калектыўны засеў азімага кліну, за завяршэньне суцэльнай калектывізацыі і за канчатковую ліквідацыю на яе аснове кулацтва, як клясы.

Сакратар Райкому КП(б)Б
Мышалоў.
Старшыня РВК **Рамноўскі.**

Пастанова

Сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб ходзе вярбоўкі рабочых для Данбасу

1. Адзначыць, што вярбоўка рабочых для Данбасу праходзіць незадавальняюча (выканана на 5-VI-31 г. 21 проц.). Пастанова Сакратарыяту ад 25-IV адпаведнымі арганізацыямі ня выканана, гэтым самым ставіцца пад пагрозу срыву выкананьне праграмы па адбываньні вугля.

Галоўнымі моментамі, якія перашкаджалі вярбоўцы вызначаюцца:

а) масавыя выпадкі нядачы дазволу калгасьнікам выязджаць у Данбас з боку праўленьняў калгасаў;

б) дрэнна праведзена арганізацыйная работа па Райкалгасаўсах па выяўленьні калгасьнікаў у Данбас згодна разьнарадзе ад 25-IV-31 г.;

в) Райкомы і Райвыканкомы не па ставілі работу па вярбоўцы ў адпаведнасьці з пастановай Сакратарыяту і гэтая работа праводзілася без мабілізацыі грамадзкай ўвагі.

Выходзячы з гэтага Сакратарыят пастанаўляе:

1) катэгарычна прапанаваць усім РК КП(б)Б зараз-жа перагрупаваць работу па вярбоўцы ў адпаведнасьці з пастановай Сакратарыяту і дабіцца тэрміновага зруху ў гэтай рабоце;

2) прапанаваць фракцыі Бежкалгас цэнтру праверыць выкананьне пастановы Сакратарыяту і дабіцца карэннага пералому ў рабоце;

Агітмасавому аддзелу ЦК праверыць выкананьне дырэктыў;

3) даручыць упаўнаважанаму па вярбоўцы перадаць ЦКК КП(б)Б факты забароны вярбоўкі для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці;

4) прапанаваць усім цэнтральным газетам узмацніць асьвятленьне ходу вярбоўкі ў друку.

Сакратар ЦК КП(б)Б Шаранговіч.

Закончыць будаўніцтва Гомсельмашу ў тэрмін

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра ход будаўніцтва заводу Гомсельмаш

Гомсельмаш ва ўмовах бурнага росту сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, яе тэхнічнае рэканструкцыі, набывае выключнае значэньне. Гэты завод павінен забясьпечыць сельскую гаспадарку БССР і шэраг іншых раёнаў Саюзу ССР цэлым сартамэнтам сельска-гаспадарчых машын.

Для найбольш хуткага заканчэньня будаўніцтва Гомсельмаша СНК БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць ВСНГ:

а) закончыць будаўніцтва і абсталяваньне заводу не пазьней III кварталу 1932 г. з тым, каб да гэтага тэрміну завод быў канчаткова пушчан;

б) цалкам забясьпечыць ажыцьцяўленьне задьверджанага пляну капітальнага будаўніцтва на 1931 г. у суме 2.700 тыс. руб і 300 тыс. руб. на жыльбудаўніцтва, найбольш хутка заканчваючы абсталяваньне ўжо пабудаваных цэхаў, як-та: ліцейны, дрэваапрацоўчы з сушылкамі і мэханічныя цэхі, вызначаючы чарговасьць, у адпаведнасьці з патрабаваньнямі вытворчай праграмы;

в) забясьпечыць поўнасьцю снабжэньне будаўніцтва Гомсельмаша асноўнымі будаўнічымі матар'ялмі фондавага снабжэньня (цэгла, цэмант, жалеза і лес) і патрэбнай колькасьцю булыжнага камню;

2. Прапанаваць Гомельскаму Гарадзкому Савету вызначыць для міжцэхавага транспарту 250 тыс. штук клінкеру, незакраналючы контынгенту вызначанага для Менску.

3. Прапанаваць ВСНГ, Дзяржаўнай Плянавай Камісіі і Народнаму Камісарыяту Фінансаў усе матар'яльныя фонды, а таксама і фінансавыя сродкі, якія прызначаны для Гомсельмаша ні ў якім выпадку не абязьлічваць, а замацаваць беспасрэдна за Гомсельмашам.

4. Прапанаваць Белмэталаб'яднаньню, Народнаму Камісарыяту Сувязі, Белбудаб'яднаньню і Дырэкцыі Гомсельмаша забясьпечыць па кам рэалізацыю вызначаных фондаў нарадаў для будаўніцтва і абсталяваньня.

5. Прапанаваць ВСНГ, Белмэталаб'яднаньню і дырэкцыі Гомсельмаша пераглядзець асобныя часткі праект будаўніцтва 1932 г. для спрашчэньня канструкцыі і патаненьня кошту гэтага будаўніцтва.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **К. Бэнэ.**
Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**

20 чэрвеня 1931 г.
Менск.

„Чырвоны сьцяг“ павінен працаваць без перабояў

„Савецкая Беларусь“ і Смалявіцкі райком КП(б)Б—арбітры паміж спаборнічаючых заводаў „Чырвоны Сьцяг“ і імя Даўмана

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

На заводзе «Чырвоны Сьцяг», працуе больш 1.000 чалавек. Завод мае дагэтуль шмат хворых момантаў, якія перашкаджаюць разгортваньню торфа здабываньня.

Асабліва ясна выявіла ўсе недахопы заводу агульна - заводзкая канфэрэнцыя ўдарнікаў.

Толькі гэтымі днямі даны загад аб мэтадах новай работы брыгад, прыма цаваньня іх да машын, тым самым ліквідавалася існаваўшая абязьлічка, якая вельмі дрэнна адбівалася на рабоце па выкананьні прамфінпляну.

У зьвязку з існаваўшай абязьлічкай, мелі месца нават шкодніцкія зьявішчы. Быў факт, калі пры зборцы машын, у балоце былі пакінуты гайкі, тапары і інш. Калі пусьцілі машыну і тарфяная маса пашла па канвэйеры, дык разам з ёю папалі і пакінутыя часткі, а-за чаго машына папсавалася. Такія факты—неаднолькавыя.

Да ліку шкодніцкіх трэба аднесьці тэхніка Алейнікава, быцога мэханіка Беразоўскага. Апошні сваю «работу» па шкодніцтве пачаў з лютага месяца, але чамусьці да яго амаль ніякіх мер ня прынята.

Такія шкодніцкія факты выклікаюць шмат прастояў машын. Да гэтага трэба дадаць, і некаторую расхлябанасьць як з боку дырэкцыі, так і з боку тэхнпэрсаналу.

Амаль на ўсіх прадпрыемствах нашага магутнага Савецкага Саюзу існуюць тэхнарады. Тут-жа на торфазводзе «Чырвоны Сьцяг» аб гэтых нарадах зусім ня чуваць і аб іх ніхто не ўспамінае; успомнілі аб ёй толькі на канфэрэнцыі ўдарнікаў.

Што да плянавага разьмеркаваньня рабсілы, работы і інш., дык трэба сказаць—плянавасьці ў рабоце, якая патрабуецца ўсякаму сацыялістычнаму прадпрыемству, няма. З-за гэтага таксама бываюць прастоі машын.

Калі-б плянава арганізаваць харчаваньне, рабочых, можна было-б больш рацыянальна скарыстаць працу рабочых. Зусім ясна, што рабочаму ці цэлай брыгадзе прыходзіцца замест адпачынку маючыхся ў іх 5 вольных гадзін, 2 гадзіны патраціць на хадзьбу за сьнеданьнем з балота да сталоўкі, а потым назад. Калі-ж могуць яны адпачыць, каб набрацца новай сілы на выкананьне пляну? А загадчык сталоўкі і адміністрацыя аб гэтым не клапоцяцца, лічыць гэта за другарадны момант.

Афіцыянткі сталоўкі ўвесь час ходзяць у брудных хвартухох. Калі аб гэтым зазначылі загадчыку каапэратыўнай сталоўкі (ён-жа загадчык сталоўкі), дык ён адказаў:

— Калі афіцыянткі будуць хадзіць у белых хвартухох, дык гэта выклікае нажадныя выдаткі...

У той час, калі на складзе маецца шмат масла, яго ня прывозяць у сталоўку і такім чынам яно псуецца на месцы, а стравы падаюцца рабочым посныя. Толькі ў апошнія дні з прыездам групы мабілізаваных партыйцаў, справа пачала паляпшацца.

Ня лепшыя адносіны да работы наглядаюцца і з боку кладаўшчыка. Калі рабочыя прыходзяць да яго прасіць струмант, кажучы, што ім трэба шпарчэй ісьці на работу, дык кладаўшчык адказвае на гэта: «Што, на работу? Вас тут багата зьбіраецца, пасьпееш.

Як відаць, яму не спадабаецца, што рабочыя цікавяцца выкананьнем прамфінпляну, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізоўваючы ўдарныя брыгады.

Ужо вядомы нам Алейнікаў, які зьяўляецца загадчыкам электратэхнічнай часткі, нічога ня робіць на працягу 3-х месяцаў. Ён адносіцца да сваёй работы дрэнна, нядбайна. Увесь час нешта разьяжджае па камандроўках, замест работы па прызначэньні, хоць каротка кажучы яму наогул рабіць няма чаго.

У гэтым годзе завод «Чырвоны Сьцяг» ня будзе электрыфікаваны і таму трымаць чалавека для нейкіх камандыровак зусім непатрэбна. Можна толькі дзівіцца, як дагэтуль існуе такая пасада, арганізаваная спэцыяльна з-за меркаваўшагася электрыфікаваньня заводу ў гэтым годзе. Рабочыя лічаць, што за кошт Алейнікава могуць працаваць два сьлесары. І яны маюць рацыю.

Для таго, каб плянава і рацыянальна скарыстаць так дарагі час і рабочую сілу, неабходна ўсё патрэбнае для пачатку работ падрыхтоўваць да прыходу рабочых на распрацоўкі. Між тым качатар разагравае машыны толькі тады, калі рабочыя прыходзяць на работу і таму апошнія прымушаны чакаць доўгі час пуску машыны.

Адмоўным баком зьяўляецца і тое, што амаль ня прыслухоўваюцца да прапаноў рабочых. А гэтыя прапановы значна палепшыць работу.

Станоўчым бакі на заводзе—гэта добра працуючыя брыгады, якія з мінімальнай колькасьцю рабочых, даюць большую выпрацоўку, але ўсё-ж таки гэта ня можа затушаваць асноўныя недахопы ў рабоце заводу, у якіх вінавата ў большай частцы само кіраўніцтва. Аб гэтым сьведчыць заява самога адміністрацыі заводу на канфэрэнцыі ўдарнікаў. У сваім дакладзе дырэктар заводу тав. Лойка так і заявіў, што адміністрацыяй шмат чаго «прахлопана» у пачатку сэзону і цяпер гэта трэба «наганяць».

Адмоўным бокам зьяўляецца і тое, што ходным, каб спажывальнікі торфу прышлі на дапамогу торфазводу «Чырвоны Сьцяг», асабліва тэхнэрсаналам, так і іншымі мерамі, каб сугодным сілам ліквідаваць стварыўшыяся прарыў на торфазводзе.

Канфэрэнцыя ўдарнікаў абвясьціла конкурс на лепшую брыгаду, лепшую зьмену і г. д. Канфэрэнцыя абгаварыла ўмову сацыялістычнага дагавору паміж торфазводам «Чырвоны Сьцяг» і торфазводам імя Даўмана. Канфэрэнцыя ўдарнікаў «Чырвонага Сьцягу» высунула арбітрам паміж заводамі «Чырвоным Сьцягам» і імя Даўмана—Смалявіцкі райком КП(б)Б і газэту «Савецкая Беларусь»

Для заключэньня дагавору абрана камісія з 4-х асоб, якая выедзе на завод імя Даўмана для падпісаньня сацыялістычнага дагавору, пасьля чаго адтуль прыедзе камісія на завод «Чырвоны Сьцяг».

Канфэрэнцыя ўдарнікаў таксама абрала дэлегатаў на ўсебеларускі зьезд рабселькораў старога рабочага тав. Астартака.

Л. Палеес.
Зав. «Чырвоны Сьцяг».

ДАЦЬ ПАДРУЧНІКІ І ПРАГРАМЫ ШКОЛАМ У ТЭРМІН

Па сьлядох рэйду брыгад газэт „Савецкая Беларусь“, „За коммунистическое Просвещение“ і ЦП працасьветы

Вынікі рэйду ўдарных брыгад газэт «Савецкая Беларусь», «ЗКП» і ЦП Працасьветы, а таксама матар'ялы, якія мае НК РСІ, гавораць аб тым, што ня гледзячы на даволі дастатковыя і падрабязныя дырэктывы партыі і ўраду, якія былі дадзены ў мінулым годзе па пытаньні падрыхтоўкі да новага навучальнага году і, ня гледзячы на тое, што гэтыя дырэктывы зьяўляюцца і на сёньняшні дзень актуальнымі і жыцьцёвымі, НКАсьветы, БДВ, БКСаюз і інш. наркаматы і арганізацыі ня ўлічылі мерудных тэмпаў мінулага году з тым, каб гэты навучальны год сустрэць арганізавана.

Возьмем галоўны вучастак гэтай работы—забесьпячэньне школ падручнікамі. Напомнім НКАсьветы, Бел. Дзярж. Выдавецтву, БКСаюзу і інш. установам і арганізацыям, што з-за спазьненьня выхаду праграм для вясковых школ, блытаніны і шкодніцтва, якое адбылося з праграмамі ў БДВ, раённыя канфэрэнцыі настаўнікаў былі сарваны. Падручнікі для школ выходзілі з друку зусім несваячасова і г. д. Аб гэтым шмат пісала «Савецкая Беларусь» і «Зьвязда».

На падставе ўсіх недахопаў і недарэчнасьцяй у рабоце адзначаных арганізацый і ўстаноў з боку кіруючых партыйных і савецкіх органаў былі прыняты рашучыя меры і дадзены адпаведныя дырэктывы. Здавалася-б, што трэба было-б таму-сяму навучыцца, як выконваць дырэктывы партыі і ўраду і як свячасова праводзіць работу і падпраддаваць яе тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва.

Атрымлівецца як раз наадварот. Вось дадзеныя: на сёньняшні дзень справа з падрыхтоўкай падручнікаў больш чымся нездавальняючая, плян БДВ выкананы толькі на 25 проц., а да навучальнага году застаўся вельмі кароткі тэрмін. Для I-га і II-га канцэнтру школ сацвыху, для ліквпунктаў, для вячэрніх школ рабочых і калгасьнікаў IIга і II-га канцэнтру прадугледжана выпусьціць 75 назваў падручнікаў. Між тым, выйшла з друку на сёньняшні дзень толькі 15, у друку знаходзіцца—32, у Белдзяржвыдавецтве 16, у Мэтадкоме—5, не здадзена аўтарамі—17.

Трэба і аўтарам напомніць аб тым, што імі падпісаны і ня выкананы дагаворы. Скажам пакуль што ад двух: Лойка і Бэндэ. Аб астатніх БДВ напэўна скажа праз друк, якія ён прыме меры для таго, каб дагаворы выконваліся свячасова.

Праграмы для школ здадзены толькі ў першых чыслах чэрвеня ў той час, як яны маглі быць ужо татовы і абгавораны на вясеньніх настаўніцкіх канфэрэнцыях. Трэба таксама адзначыць, што праграмы не атрымалі належнай грамадзкай апрацоўкі і належнай праверкі. Факт гаворыць сам за сябе. Наркамасьветы зараз праводзіць курсы раённай інспэктуры і вось некаторым было прапанавана пратлядзець і прапрацаваць праграмы за некалькі дзён. Бясумоўна, ніхто не згадзіўся з такім мэтадам працы. Як і летась, сёлета справа праходзіла больш габітэтна, чымся ў грамадзкасьці.

Паліграфаб'яднаньне на сёньняшні дзень не разгрузіла друкарню імя Сталіна ад іншых выдавецкіх работ, яно не перадала іх у другія прадпрыемствы (Магілёў, Віцебск, Гомель, Барыйск) з тым, каб максымальна скарыстаць ратацыённую машыну для надрукаваньня падручнікаў.

Плянавае Бюро НКАсьветы да гэтага часу не паклапацілася пракантраляваць сваіх распаяньняў і, як кажуць, згубіла іх у бюрократычнай цёне. Дабным-дабно Наркамасьветы прапанавае Белкаапсаюзу і БДВ баз яго кафэцыянтаў не рабіць завозу ў раёны, але потым забыўся і на сёньняшні дзень, ня гледзячы на напамінкі, гэтыя «кафэцыенты» НКАсьветы не дадзены. Бегае працаўнік БДВ, бегаюць работнікі БКСаюзу ў НКАсьветы, з НКА на базу, але ніяк дагаварыцца ня могуць аб тым, што падручнікі трэба ўжо было даўным-даўно накіроўваць у раёны. На базе БДВ ляжыць падручнікаў на прыблізнаму падліку на 350-400 тыс. руб. На такую-ж лічбу са значным, бясумоўна, перавышэньнем, ляжаць падручнікі на базах БКСаюзу.

Ня толькі БКСаюзу, НКАсьветы, БДВ магчыма было даговарыцца памiж сабой, каб праца па падрыхтоўцы да навучальнага году знайшла ў гэтых установах бальшавіцкае пераламленьне, але можна было скарыстаць курсы раённых інспэктароў, якія праходзяць у Менску. Не, трэба было абавязкова гэтым усім установам, каб ім напомніла РСІ. Калі НК РСІ склікаў нараду з прадстаўнікоў НКАсьветы, БДВыдавецтва, БКСаюзу і рашуча было пастаўлена, што робіцца ў напрамку забесьпячэньня школы кнігамі, то адказ ад гэтых прадстаўнікоў быў: «Так, НК РСІ свячасова паставіў гэта пытаньне». А калі пачалі разьбіраць пытаньне па сутнасьці самой справы, то выявілася ня толькі недагаворанасьць, а нават непрадуманасьць гэтага пытаньня з боку адзначаных устаноў. Колькі пісалася, колькі гаварылася аб тым, што работа кожнага працаўніка павінна быць рэгламэнтавана, што кожны працаўнік той ці іншай установы павінен ведаць свае функцыі, кантраляваць сваю работу, свячасова рэагаваць на ненармальнасьці ў рабоце інш. устаноў праз друк, крытыку і самакрытыку, але, як мы бачым, гэтага з боку некаторых работнікаў НКАсьветы, работнікаў БДВ, у асаблівасьці БКСаюзу не наглядаецца.

Па прапанове НК РСІ была склікана нарада пры БКСаюзе, на якой прысут нічала да 50 інспэктароў з месц, прад стаўнікі НКАсьветы, БДВ і інш. арганізацый. З спрэчак на нарадзе высьвятлілася, што раённыя спажывецкія каапэратывы зусім нядбайна адносяцца да справы свячасовай дастаўкі падручнікаў у школы. Прыводзіліся прыклады, калі ў мінулым годзе падручнікі пралежвалі па месяцы і больш на пацах каапэратываў, на складах, а некаторыя з іх «убачылі» школы і дзяцей у канцы навучальнага году. Высьвятлілася, што ўсё гэта залежыць ад таго, што БКСаюз ня прымае ніякіх мерапрыемстваў у адносінах наладжваньня работы па распаўсюджваньні падручнікаў і масавай літэратуры. Характарны факт, што ў мінулым годзе з-за адсутнасьці крэйды сарваліся заняткі ў школах, але і на сёньняшні дзень у гэтым напрамку справа праходзіць марудлымі тэмпамі.

Райвыканкомы таксама не асабліва клапоцяцца аб школах. Так, старшыня Узаравіцкага РВК адказвае інструктару па кніжнай справе: «Грошы за падручнікі і прылады я буду плаціць не раней, як у верасьні месяцы». Такіх РВК на сёньняшні дзень маецца 42. Некаторыя з іх пералічым: Азарыцкі, Астрашыцка-Гарадзецкі, Асьвейскі, Барысаўскі, Ветрынскі, Жыткавіцкі, Заслаўскі, Лепельскі, Менскі прыгарадны, Парыцкі, Расонскі, Слуцкі і інш. Гэтыя 42 раёны на сёньняшні дзень яшчэ не далі сваіх заявак на падручнікі, на наглядныя дапаможнікі, спыткі, алоўкі і інш. прылады. Поўная «клапатлівасьць» з боку гэтых РВК прывяла да затаварваньня БДВ і БКС. Калі ў мінулым годзе ня было спыткаў, перад пачаткам навучальнага году, то РВК пасылалі—тэлеграмы, пасылалі рапарты ў 5—12 копіях, а цяпер, калі ўсякай лішкавай пісаніны матчыма ўнікнуць шляхам гаспадарчай прадуманасьці і свячасовага выраўнаньня ўсіх пытаньняў, яны нічога ня робяць у напрамку забесьпячэньня школ.

Ня прыходзіцца гаварыць аб іншых недахопах у справе падрыхтоўкі да новага навучальнага году, аб гэтым яскрава сьведчаць матар'ялы рэйду ўдарных газэт «Сав. Бел.», «ЗКП» і ЦП Працасьветы. Аб гэтым пісала «Зьвязда» і раённыя газэты. Тут патрабуецца прыняць самыя рашучыя захады да таго, каб усе выяўленыя прарывы былі свячасова зьнішчаны.

Сацыяльна-Культурная Груша НК РСІ Бел. у сучасны момант праводзіць работу па кантролі і праверцы пастановы партыі і ўраду па падрыхтоўцы да навучальнага году. Адначасова з праверкай зараз-жа ўсе Наркаматы, гаспадарчыя і прафэсыянальныя арганізацыі, якія маюць у сваім падпарадкаваньні навучальныя установы, павінны праверыць сябе, што зроблена ў напрамку падрыхтоўкі да навучальнага году; што яшчэ ня прадугледжана, трэба зараз-жа прадугледзець і разгарнуць работу бяззмы тэмпамі. Што-ж да пытаньня забесьпячэньня школ падручнікамі, НК РСІ, на падставе маючыхся матар'ялаў, вынес ніжэйнаступную пастанову:

1) Прапанаваць БДВ зараз-жа правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) на працягу 5 дзён здаць у друк усе падручнікі, якія знаходзяцца ў Галоўліце і БДВ;

б) прыцягнуць да адказнасьці тых аўтараў, якія не выконваюць дагавораў па напісаньні падручнікаў;

в) БДВ і НКАсьветы зараз-жа вызначыць чаргу друкаваньня падручнікаў у адпаведнасьці першачарговасьці ў іх рабоце;

г) з мэтай паскораньня выхаду падручнікаў з друку, практыкаваць падзел іх на часткі;

д) пад асабістую адказнасьць т. Некрашэвіча забясьпечыць свячасовы выхад з друку падручнікаў.

е) прапанаваць пад асабістую адказнасьць старшыні трэсту Паліграфаб'яднаньня т. Сінчука прыняць захады да свячасовага выхаду падручнікаў, здадзеных выдавецтвам у друк;

ж) у мэтах разгрузкі друкарні імя Сталіна загрузіць іншыя друкарні БССР і забясьпечыць максымальнае скарыстаньне друкарні імя Сталіна на друк падручнікаў.

2. Прапанаваць НКАсьветы зараз-жа высьвятліць асоб, вінаватых у несвячасовай дачы каэфіцыентаў па завозе падручнікаў у раёны і прыцягнуць да адказнасьці.

3. НКАсьветы спрасьціць парадак праверкі падручнікаў з такім разьлікам, каб падручнікі на рэцэнзіі знаходзіліся ня больш 10 дзён.

4. НКАсьветы спыніць падрыхтоўку падручнікаў вялікіх па аб'ёму, зьвярнуць увагу на зьмест і папулярнасьць.

5. Прымаючы пад увагу, што напісаньне падручнікаў без увязкі з праграмамі прыводзіць да кожнагоднай пераробкі і што ня было моманту стэрэатыпнага перавыданьня падручнікаў, —прапанаваць НКАсьветы прыняць усе захады да стабілізаваньня падручнікаў.

6. Прапанаваць усім РайКК-РСІ зараз-жа прыступіць да кантролю ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў з боку РВК па забесьпячэньні школ падручнікамі, наглядныямі дапаможнікамі, спыткамі і інш. прыладамі і наогул усіх мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да навучальнага году.

Добрускай РКК-РСІ праверыць выкананьне дагавору паміж Добрускай папяровай фабрыкай і БДВ па адгрузцы паперы.

7. Прапанаваць БКСаюзу да 20 чэрвеня даць БДВ разнарадку на падручнікі для тых раёнаў, якія да 13 чэрвеня далі свае заяўкі. Работу па адпраўцы падручнікаў праводзіць ударнымі тэмпамі з тым, каб падручнік пасьля выхаду яго з друку, не знаходзіўся больш 3-х дзён у шляху ад БДВ да раёну і ня больш 2-х дзён у раёне да адпраўкі непасрэдна ў школу.

8. Праўленьню БКС забясьпечыць патрэбнымі лімітамі райснажсаюзы для бесьперабойнай аплаты падручнікаў і прыладаў, заказаных у раёны ў чэрвені, ліпені і жніўні месяцах, прызначаных для забесьпячэньня новага навучальнага году.

9. Прапанаваць БКС распрацаваць стадую тэхніку завозу падручнікаў і прылад для школ раёну з такім разьлікам, каб яны былі дастаўлены ў школы альбо ў сельсаветы не пазьней 15 жніўня.

10. Паставіць пытаньне перад НКФ аб забесьпячэньні РВК патрэбнымі сродкамі для бесьперабойнай аплаты падручнікаў і прыладаў, засылаемых у чэрвені, ліпені і верасьні па меры іх паступленьня ў раёны.

11. Прымаючы пад увагу катастрафічнае становішча БДВ з тарай, што перашкаджае свячасовай адпраўцы падручнікаў у раёны, прапанаваць Бел дзяржсхабу свячасова выконваць умовы, заключаныя з БДВ на дастаўку цэлюлёзу.

12. Паставіць пытаньне перад Оргтарай аб недапушчэньні зрыву свячасовай пасылкі падручнікаў у раёны з-за адсутнасьці тары.

13. Прапанаваць БДВ прапрацаваць пытаньне аб загатоўцы стандартных брэзэнтавых мяшкоў для адпраўкі падручнікаў і масавай літаратуры ў раёны, ажыцьцявіўшы вопыт пасылкі такім чынам літаратуры і падручнікаў пакуль што з 10 раёнамі.

Адначасова з гэтай пастановай указана асноўным наркаматам па падрыхтоўцы кадраў НКАсьветы, НК Аховы Здароўя, НКЗему, ВСНГБ аб разгортваньні працы па ўкамплектаваньні ВНУ, Тэхнікумаў і інш. школ, па свячасоваму разьмеркаваньні і падрыхтоўцы для іх, як навучальнай плошчы, так і інтэрнатаў, аб прапрацоўцы пытаньня ў бок канкрэтызацыі з тым, каб забясьпечыць харчаваньнем студэнцтва і вучнёўства, і каб зараз было пракантраляваны пытаньне аб ходзе выкананьня заявак пададзеных у снабжэнцкія органы.

А. НІКАЛАЕЎ.

Аб выніках праверкі выкананьня

пастаноў ЦКК УсеКП(б) ад 19-VIII1929 г. і ад 12-I—1931 г., а таксама і пастаноў ЦКК КП(б)Б у адносінах зьняцьця з работы скампрамэтаваўшых і не апраўдаўшых сябе членаў партыі на адказнай рабоце

Пастанова аб'яднанага паседжаньня прэзыдыуму і партканкалегіі ЦКК КП(б)Б ад 14-V 1931 г.

Праверка выкананьня парторганамі рашэньняў ЦКК у адносінах таварышоў, зьнятых з кіруючай работы з забаронай займаць гэткую на працягу пэўнага часу, як скампрамэтаваўшых і неапраўдаўшых сябе на гэтай рабоце, —паказала, што гэтыя рашэньні ў асноўным хоць і выконваюцца, але ў многіх выпадках ігнаруюцца. Таварышы перакідваюцца на іншую гэткую-ж ці больш адказную работу; замест выкананьня ўказаньня органаў КК аб пасылцы на нізавую работу ці на вытворчасьць па спэцыяльнасьці

Спаткаць ураджай у баявой гатоўнасьці

Дабіваючыся поўнага выкананьня пасеўных плянаў, пераключыцца на шырокую падрыхтоўку да ўборачнай

Правільная расстаноўка сіл, поўная ліквідацыя абязьлічкі, зьдзельшчына, вучот работы, сваячасовы рамонт інвэнтару—вырашаюць посьпех уборачнай кампаніі

СЛУЦКАЯ МТС ПРАВАЛЬВАЕ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРАЧНАЙ

Слуцкая МТС яшчэ 4 чэрвеня склала плян падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі па калгасах у межах сваёй дзейнасьці. Але, на вялікі жаль, гэтыя пляны яшчэ не даведзены ні да калгасаў, ні да брыгад. Пытаньне аб складаньні рабочых плянаў унутры самых калгасаў таксама ідзе да гэта га часу ня ставіцца.

Як калгасныя масы, так і масы адпасобнікаў на падрыхтоўку да ўборкі не мабілізаваны.

Рамонт інвэнтара намячалася скончыць да 20 чэрвеня, але-ж плян прадугледжвае пачаць уборку канюшыны з 10 чэрвеня, а прычэпкі для ўборачнага інвэнтара будуць зроблены майстэрняй МТС толькі 10 ліпеня. Такая непагоджанасьць у тэрмінах стварае небясьпеку зрыву ўборачнай.

Сама МТС да гэтага часу не здала у рамонт складанага ўборачнага інвэнтара: ў нясправнасьці-ж ёсьць 4 сенакасілкі, 8 жатак-самаскідалак, 17 малатарняў, 5 сартовак, і 100 калгасных калёс.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што ў сучасны момант майстэрня па рамонту с.-г. машын ня мае поўнай нагрузкі, а пазьней, калі з усіх бакоў пачнуць дастаўляць інвэнтар, яна ня справіцца з работай.

Адсутнасьць заменных частак для жнярак і недахват касілак (16 шт. замаражана, але да гэтага часу ня прысланы Белсельснабам) зьяўляецца не малой пагрозай сваячасоваму правядзеньню ўборачнай кампаніі.

Яшчэ канчаткова не прымацаваны трактарныя брыгады да калгасаў, ня гледзячы на тое, што арыентоўны вучот цягавай і рабочай сілы ў кожным калгасе ўжо праведзен.

Работа трактароў пераводзіцца на брыгадны мэтад (5 трактароў у брыгадзе). Гэта дае ўпэўненасьць, што прарывы, якія існавалі ў час сяўбы, будуць ліквідаваны. Да кожнага трактара прымацавана 3 рабочых. Гэтым самым ліквідавана абязьлічка. Аднак, зьдзельшчына на трактарох ня ўведзена. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж трактарыстамі не разгорнута.

Дырэктар МТС кажа:

— Ня ўведзена зьдзельшчына вусім сьвядома, бо ў нас няма добрых трактарыстаў, а ад вучняў няма чаго патрабаваць.

Такім чынам, у МТС сьвядома зрываюць зьдзельшчыну. Па такіх настроях неабходна ўдарыць з усёй рашучасьцю. Трэба дабіцца, каб у час уборачнай кампаніі ўсе работы былі пераведзены на зьдзельшчыну.

Калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, перайшлі на зьдзельшчыну, але большая частка толькі фармальна, бо ніякага вучоту якасных паказьнікаў няма, эфэктыўнасьць зьдзельшчыны не папулярызавана сярод шырокіх мас калгаснікаў.

Усе недахопы ў падрыхтоўцы МТС да ўборкі трэба зараз-жа выправіць, каб посьпехі ўборачнай кампаніі забясьпечылі новы магутны прыліў у калгасы бяднацка-серадняцкіх мас вёскі.

Брыгада «С. Б.»: А. Курдо, Ал. Жаленя, Алена Маіхровіч.

Праполачная кампанія зрываецца

У саўгасе імя Будзённага (Менскі прыгарадны раён) праполачная кампанія праходзіць самацёкам.

У гэтым саўгасе ёсьць 17 га гароду, якія засеяны пад наступныя культуры: кармовых буракоў—11 га, сталовых буракоў—1,5 га, моркавы сталовай—1 га, памідораў—1,5 га, капусты—2 га і інш.

На 20 чэрвеня праполана толькі 4 га буракоў.

Аспэўнае, што зрывае праполачную кампанію—гэта нерацыянальнае выкарыстаньне рабочай сілы: Студэнты-практыканты Менскага бел. пэд. тэхнікуму пасылаюцца на розную дробязную работу, а не на праполачную работу. Інвэнтар, патрэбны для праполкі, нястраўны, рамонт праходзіць слаба. І асноўнае, што спрыяе самацёку ў працы па праполцы, гэта тое, што праца ў садзе і гародзе не пераведзена на зьдзельшчыну.

Каб прапалоць 1 га буракоў, адміністрацыя пасылае на работу 60-70 чалавек, якія за дзень выконваюць толькі палову нормы. Зусім не вядзецца вучот работы. Гародзік і садоўнік ня хочуць работы пераводзіць на зьдзельшчыну. Такое кіраўніцтва прыводзе да поўнага зрыву праполачнай кампаніі.

А. Заслаўскі.

Клясаваму ворагу не даецца належнага адпору

(Радамскі сельсавет, Чавускага раёну)

Сыстэматычнай работы з беднатой у Радомскім сельсавеце не праводзіцца. Гэта работа праводзіцца толькі ў час палітычна-гаспадарчых кампаній, дый то не заўсёды. Партыйная ячэйка да апошняга часу не надае гэтай справе адпаведнай увагі.

Такое становішча выкарыстоўвае кулацтва для агітацыі супроць калгасаў. У п. Радучы члены сельсавету Рыпінскі Цімох сын былога кулака-эксплёватара і Лурыкаў Мікола—кулацкі пад павала, які выпадкова трапіў у склад сельсавету тэрарызуюць бяднацка-серадняцкую частку насельніцтва. Напрыклад пераважную колькасьць загатовак яны ўскладалі на беднякоў і середнякоў, а да кулацтва аднесьліся вельмі спачувальна. Гэткаму скажэнню палітыкі партыі не даецца належнага адпору. Гэтым тлумачыцца і тое, што па Радамскім сельсавеце рад палітычна-гаспадарчых заданьняў ня выкананы.

Партыйэйка павінна ў самы кароткі тэрмін наладзіць сыстэматычную работу з беднатой, ачысьціць склад сельсавету ад чужых людзей і стаць на чале кіраўніцтва сельсаветам.

Травень.

МОПР—на перадавыя пазыцыі ўборачнай

Перад мопраўскімі арганізацыямі БССР стаіць баявая задача, зараз-жа ўключыцца ў дапамогу на пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

Буйныя арганізацыі МОПР'у БССР (Гомель, Менск, Віцебск і інш.) маюць даволі значны вопыт у справе мабілізацыі мопраўцаў па ўдзелу ў сацбудаўніцтве. Гомельскі Гарком МОПР'у ў мінулым годзе ў час уборкі ўраджаю, арганізаваў ударныя мопраўскія брыгады, у якіх прынялі ўдзел каля 300 чал., аказана вялікая дапамога калгасам па ўборцы ўраджаю. Менскі Гарком МОПР'у некалькі тыдняў таму назад мабілізаваў больш 1000 мопраўцаў, якія выяжджалі ў прыгарадныя гаспадаркі МЦРК і ліквідавалі прарыў у сяўбе.

Няма ніводнай гаспадарча-палітычнай кампаніі, у якой-бы ня прымала ўдзел арганізацыя МОПР'у БССР.

Ячэйкі МОПР'у павінны правядзіць ініцыятыву ў давядзеньні плянаў уборачнай да калгаснікаў, да рабочай брыгады. Мопраўцы павінны быць першымі ініцыятарамі ў арганізацыі ўдарных брыгад МОПР'у ўборачнай кампаніі.

Перад ячэйкамі МОПР'у фабрык і заводаў, якія вырабляюць с.-г. машыны, рамонт с.-г. машын (завод Варашылава, «Ударнік» і інш.) стаіць задача перавыкананьня прамфінпляну, за сваячасовае забясьпячэньне ўборачнай машынамі, рамонтам і г. д.

Ячэйкі МОПР'у чыгункі і воднага транспарту павінны ўзяць на сябе абавязак сваячасова, хутка і ў тэрмін прасоўваюць усе грузы для ўборачнай і пасеўнай кампаніі.

Гарадзкім арганізацыям МОПР'а патрэбна зараз-жа мабілізаваць мопраўцаў на практычную дапамогу прыгарадным гаспадаркам (праполка і ўборка ўраджаю), дагаварыцца а адпаведнымі арганізацыямі аб патрэбнасьці ў рабочай сіле і месцы яе скарыстаньня з тым, каб у гарачы час можна было-б кідаць сілы мопраўцаў на дапамогу.

Мопраўскім арганізацыям трэба ў час уборачнай кампаніі разгарнуць шырокую інтэрнацыянальна-масавую работу асаблівa ў абагуленым сэктары сельскае гасп., павесьці падрыхтоўчую работу, каб у час асеньняй пасеўнай кампаніі калгасы і саўгасы засеялі мопраўскія інтэрнацыянальныя гектары ў карысьць палітзьняволеных пад шэфных турмаў.

Уся работа мопраўскіх арганізацый, ячэек на лепшым ўдзеле ў падрыхтоўцы да ўборкі павінна праводзіцца на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Мопраўскім арганізацыям і ячэйкам патрэбна праз друк выявіць мопраўцаў энтузіястаў на фронце ўборачнай кампаніі, а таксама зрыўшчыкаў уборачнай.

Левін. Л.

Па-ўдарнаму падрыхтаваліся да касьбы

У саўгасе Вязань-Фанішаль пачалася касьба канюшыны. Усяго ў гаспадарцы знаходзіцца 315 га сенажаці і 307 га канюшыны. Гаспадарка мае 14 сенакасілак і 7 конных грабель. Канюшына косіцца сенакасілкамі, а сена жаці, за выключэньнем 15 га, будуць касіцца ўручную.

Да сенаўборачнай кампаніі саўгас падрыхтаваўся належна. Сенаўборачныя машыны адрамантаваны. Складзен плян уборкі, які даведзен да кожнага рабочага. Усе работы пераведзены на зьдзельшчыну. Да гэтага часу ўбрана 35 га канюшыны. 20 чэрвеня пачалася ўборка сенажаці.

Для правядзеньня сенаўборкі саўгас ня спрабуе ся сваімі сіламі. Прыдзецца выкарыстаць дапамогу вакольных калгасаў. Саўгас наладзіў узаемадапамогу з калгасамі—калгасы дапамогуць яму ўбраць сена, а саўгас дапаможа ім рознымі машынамі.

К.

Уборачная пад пагрозай зрыву

Падрыхтоўчая работа да ўборачнай кампаніі ў Копыскім раёне яшчэ не пачата. Ні ў раённых установах, ні па сельскіх саветах гэтае пытаньне яшчэ не распрацавана. Тут яшчэ не задумаліся аб тым, как складзіць пляны ўборкі, сенакашэньня. Рамонт машын да ўборкі яшчэ таксама не пачаты.

Ня чуваць яшчэ нічога і пра сіласную кампанію. Некаторыя калгасы прывезьлі насеньне сланечніка, але сяўба гэтай культуры праходзіць над звычайна марудна. Таксама не пачата яшчэ падрыхтоўка і пабудова памяшканьняў і іх дэзынфэкцыя для фуражных і насенных фондаў.

Нічога практычнага яшчэ ня зроблена ў галіне арганізацыі працы ў калгасах на час работы, нормы выпрацоўкі не ўстаноўлены, зьдзельшчына ігнаруецца, брыгады не арганізаваны.

Усё гэта ставіць пад пагрозу зрыву ўборачную кампанію.

Брыгада газ. «Савецкая Беларусь»: Генін, Росман.

Пра зьдзельшчыну ня ведаюць

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі ў саўгасе імя Будзённага (Менскі прыгарадны раён) зрываецца.

Плян правядзеньня ўборкі яшчэ не даведзены да рабочых саўгаса.

С.-г. машыны патрабуюць рамонту, які яшчэ не пачаўся, машыны валяюцца па двары паламаныя. Касілкі, якіх маецца ў саўгасе 3, не гатовы да сена косу, у іх не хапае частак.

Гумно для ўборкі не падрыхтавана. Яно завалена розным хламам і рэшткамі леташняга ўраджаю. Сьвіран і падвал таксама загружаны.

Тара (мяхі, кашы і інш.) валяецца дзе попала і гніе ў грязі бяз догляду.

Да 20 чэрвеня 31 г. саўгас яшчэ не прыступіў да ўборкі, ня гледзячы на тое, што канюшыну і сена ўжо патрэбна ўбіраць.

Усё гэта гаворыць аб дрэнным падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі. У працы па падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю, асноўнае, што зрывае працу, гэта тое, што саўгас не перайшоў на зьдзельшчыну. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва адсутнічае.

А. З.

Пра нормы ўборкі Менскі РКС забыўся

Менскі райкалгассаюз пляны ўборкі па калгасах разаслаў сваячасова, аднак пра нормы выпрацоўкі на час уборкі райкалгассаюз не падумаў і на сёньняшні дзень калгасы ня ведаюць, як уводзіць зьдзельшчыну ва ўборцы і правільна ўлічваць працу.

Калгасы зусім не забясьпечаны ўборачным інвэнтаром. Ні адна машына яшчэ не атрымана, а райкалгассаюз ня дбае аб гэтым. Рамонт машын праходзіць слаба. Рамонтныя майстэрні стаяць з-за адсутнасьці вугалю. І тут райкалгассаюз не паклапоціцца, каб атрымаць адпушчаную колькасьць вугалю і забясьпечыць ім майстэрні.

Частка калгасаў Менскага раёну на зьдзельшчыну перайшла фармальна: райкалгассаюз не прымае ніякіх захаваў і не клапоціцца аб правільным скарыстаньні зьдзельшчыны і наладжаньні вучоту працы.

Толькі калгасы імя Дзяржынскага, Акадэміі Навук і ДПУ паказалі добрыя вынікі ўвядзеньня зьдзельшчыны. У калгасах-жа Фолька і Калодзежнікі зьдзельшчына сарвана ў час веснавой сяўбы, зрываецца і цяпер у час уборачнай.

Паміж калгасамі і саўгасамі адсутнічае ўзаемадапамога.

Усе перашкоды ў правядзеньні ўборачнай кампаніі райкалгассаюз павінен неадкладна зьнішчыць, каб забясьпечыць сваячасовае выкананьне ўборкі.

Брыгада «Сав. Бел.»
Сьцяпанаў, Пенкрат.

Неадкладна перавесьці ўсю работу на зьдзельшчыну

Слуцак. (Наш. кар.). Ня гледзячы на тое, што набліжаецца час уборкі, калгас «Шлях Калектывізацыі» Слуцкага раёну да гэтага часу ня склаў рабочага пляну ўборачнай кампаніі.

Інвэнтар не адрамантаваны, транспарт (вазы, абруч) таксама ня прыведзены ў гатоўнасьць.

Дрэнная справа і са зьдзельшчынай, якая ўведзена толькі фармальна і не па ўсіх галінах. Брыгадная форма зьдзельшчыны адсутнічае зусім. Абязьлічка мае шырокае месца ў калгасе: коні, вазы і інш. не замацаваны ні за брыгадамі, ні за калгаснікамі. Гэта стварае прарывы ў рабоце.

Прасьцейшая форма вучоту, рэкамендаваная Калгасцэнтрам ня ўведзена і наогул вучот працы пастаўлен вельмі дрэнна. Працоўныя кніжкі калгаснікам да гэтага часу ня выданы.

На ўсё гэта Райкалгассаюзу трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, каб у першую чаргу правільна арганізаваць працу, праз увядзеньне зьдзельшчыны па ўсіх галінах гаспадаркі. Гэта папярэдзіць прарыў ва ўборачнай кампаніі.

За складаньне рабочага пляну і рамонт інвэнтара неабходна ўзяцца зараз-жа, бо час не чакае.

Ал. Курдо.

Адсутнасьць ясьляў—перашкода ўборачнай

Зараз на Копыскім пачалася падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі. Калгасы актыўна рыхтуюцца, каб сустрэць яе ўзброенымі. Рыхтуецца і наш калгас «Бальшавік» Старасельскага сельсавету. Але на гэтым шляху ёсьць адна вялікая перашкода, у калгасе няма дзіцячых ясьляў. У часе уборкі частка жанчын ня зможа поўнасьцю ўдзельнічаць ва ўборачнай кампаніі. Жанчыны на ўсіх сходах патрабуюць, каб адкрылі ясьлі. Але старшыня калгасу Зелікаў кажа, што яму няма часу займацца такім дробным пытаньнем. Такія выпадкі можна назраць па ўсім раёне. РВК і Калгассаюзу трэба дапамагчы калгасам арганізаваць дзіцячыя ясьлі, каб даць магчымасьць жанчыне ўдзельнічаць ва ўборачнай кампаніі.

Ударнік.

Парады да сенаўборачнай кампаніі

Арганізацыя працы. Для пасьпяховага правядзеньня сенаўборкі неабходнай умовай зьяўляецца падрыхтаванасьць і правільная арганізацыя працы. Стварэньне спэцыяльных брыгад з ужываньнем прыцыпаў выдзельнай аплаты працы, увядзеньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сваячасовая іх расстаноўка на паасобныя вытворчыя вучасткі—зьяўляецца абавязковым для пасьпяховай сенаўборкі кожнага калгасу і саўгасу.

Вытворчасьць сенаўборачных машын за 10 гадзін працоўнага дню складае: конная сенакасілка 3-4 га, конныя граблі 6-8 га.

Нормы працадзён на 1 га наступныя: ручная касьба 2 дні, зграбаньне ўручную 1-1,5 га, сушка, варушэньне і кладка коп 3-4 дні:

Машыны павінны працаваць у дзьве зьмены ня менш 16-ці гадзін.

Час уборкі. Трэба строга прытрымлівацца дакладных тэрмінаў сенаўборкі. Касьба павінна пачынацца за 5-6 дзен да красаваньня, г. зн. у час поўнага калашэньня. Уборка паводзіцца з такім разьлікам, каб да часу поўнага красаваньня асноўных траў на дзяным участку яна была скошана. Скошаная пасьля красаваньня трава дае сена грубое і значна горшай якасьці.

Паасобныя травы ўбіраюцца ў наступныя стадыі разьвіцьця: канюшына чырвоная—у пачатку красаваньня, цімафейка—да пачатку красаваньня ў час поўнага калашэньня, аўсяніца, лісахвост, мятлюк луговы—да пачатку красаваньня, вика—у час красаваньня.

Сушка травы. Сушка ў валох ці прыкосах вытрымліваецца займаецца шырокай стай. Пры гэтым спосабе скошаная трава пакідаецца ў пракосах да наступнага дню. Пад вечар наступнага дню трава зграбаецца ў валы, у якіх яна сохне 2-3 дні. Калі трава дастаткова прасохла, кладуць невялікія копы, дзе яна канчаткова высыхае. Копы трэба добра завяршыць.

Пры сушэньні сена ў валох можна абмінуць страты ад абломкі самых багатых пажыўнымі матэрыямі лісточкаў і далікатных маладых галінак. Сушэньне канюшыны і віка-аўсянай мешанкі неабходна праводзіць выключна ў валох або пры дажджлівым надвор'і ў дробных кучках.

Пры звычайным сушэньні з ужываньнем варушэньня гэтыя травы трацяць вельмі шмат сваёй спажыўнасьці.

Пры сушэньні канюшыны і віка-аўсянага сена, скошаную траву ў тойжа дзень або на другі, у залежнасьці ад надвор'я, трэба згрэбсьці ў валы, і пакінуць так на 1-2 дні. Пасьля гэтага валы пераварачваюцца віламі на другі бок. Калі такім чынам канюшына прасохла можна два валы злучыць у адзін і пакінуць яшчэ на дзень. Такія высушаныя валы потым складаюцца ў копы ці вазоўцца ў пуні.

Для віка-аўсянай мешанкі зьяўляецца абавязковым складаньне ў копы для дасушваньня, бо яна вельмі марудна сохне.

Калі даводзіцца складаць у торп на зусім добра высушанага сена вельмі добра бывае яго пасаліць. На 100 цэнт нераў сена бярэцца 1 цэнт. соді.

А. І. Берэзін.

Сыгналізуем небясьпеку зрыву будаўніцтва сьвінарнікаў

Плян будаўніцтва выканан толькі на 12 проц. Белсельбуд не забясьпечвае тэхнічнага кіраўніцтва

Неадкладна мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў. Поўнасьцю выканаць будаўнічыя пляны

Будаўніцтва сьвінарнікаў на задворках

Арганізацыя сьвінагадоўчых таварных калгасных фэрмаў мае выключнае значэньне ў справе вырашэньня мясной праблемы. Сёлета ў сьвінагадоўчых фэрмах БССР павінна быць пастаўлена 150.000 сьвінаматак. Але нармальнае разьвіцьцё сьвінагадоўлі і кам плектаваньне гаспадарак упраецца ў будаўніцтва сьвінарнікаў.

На 1931 г. намечана пабудаваць: 50.000 месц для парасных матак, 75.000 месц. халастых, 19.500 месц адкормачнікаў і г. д. Кошт сьвінарнікаў вызначана ў суме 16.650.000 руб. Як відаць з паданых лічбаў, праграма будаўніцтва досыць значная. Для пасьпяховага выкананьня яе патрабуецца належнае ўвага з боку нашай грамадзкасьці.

На справе мы маем зусім адваротнае. Будаўніцтва сьвінарнікаў разгортваецца вельмі марудна. На 1 чэрвеня плян работ па будаўніцтву сьвінарнікаў па калгасах выкананы ўсяго на 12 проц. Крэдыты адпушчаныя на будаўніцтва выкарыстаны ўсяго на 9,5 проц. Гэтыя лічбы характарызуюць недапушчальныя тэмпы будаўніцтва, якія сыгналізуюць аб тым, што плян будаўніцтва сьвінарнікаў знаходзіцца пад пагрозаю зрыву.

Адным з сур'ёзных недахопаў, зьяўляецца незабясьпечанасьць рабочай сілай. На будаўніцтве сьвінарнікаў занята толькі 40 проц. патрэбнае рабочае сілы. Прадпісаныя калгасам не зварочваюць на гэта належнай увагі. У Койданаўскім раёне з намечаных па плану 24 сьвінарнікі да гэтага часу пабудаваны толькі 1 і 6 пачата. У Вушацкім раёне па радзе калгасаў будаўніцтва выкананa ў нязначных разьмерах, у калгасе «Згода»—10 проц., у калгасе імя Дзяржынскага будаўніцтва зусім зрываецца з прычыны недахопу рабочай сілы.

На Лельчацкім раёне будаўніцтва сьвінарнікаў, таксама слаба разгортваецца. На плану гэтага году намечана пабудаваць 9 сьвінарнікаў, ня гледзячы на тое, што з пачатку будаўнічага сэзону прайшло 5 месяцаў—пачалі будаваць толькі 4.

Трэба зьвярнуць сур'ёзную увагу на забясьпячэньне будаўніцтва цьвікамі, цэглай, жалезам і інш. дэфіцытнымі матар'ямі.

Мы ня раз зварачвалі ўвагу на тое, што тэхнічнае кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам вельмі дрэннае. Тэхнікаў і дзесятнікаў вельмі мала. У радзе месц будаўніцтва праводзіцца без тэхнічнага кіраўніцтва. У Дубровенскім Райкалгассаюзе нават няма дзесятніка, гэтай справай кіруе сам старшыня райкалгассаюзу. Такое-ж становішча наглядаецца па Талачынскім, Дрыбенскім і інш. раёнах.

Кваліфікацыя маючыхся тэхнікаў і дзесятнікаў вельмі нізкая. НКП замест тэхнікаў паслаў на будаўнічыя работы ў калгасы дзесятнікаў і практыкантаў з прафшкол, у выніку гэтага будаўніцтва нізкай якасьці. У Вушацкім раёне мураваныя слупы ў сьвінарніках хіталіся, калі пагарушыць іх рукамі. У Койданаўскім раёне дзесятнік за кожнай дробязьзю зварочваецца ў будаўнічы сэктар Белкалгасцэнтру.

Якасьць будаўніцтва вымагае біць трывогу, трэба зараз папярэдзіць розныя прарывы ў пабудове сьвінарнікаў. Трэба дабіцца, каб Белсельбуд у супрацоўнасьці дапамагаў сваёй кансультацыі калгаснаму будаўніцтву. Гэтага пакуль што няма. Будаўнічыя канторы Белсельбуду павінны ўзяць шэфства над будаўніцтвам у калгасах і ўсямерна дапамагаць па тэхнічным кіраўніцтве.

Зараз, калі веснавая сяўба ў асноўным ужо скончана, трэба ўдарна пераключыцца на будаўніцтва. На будаўнічых работах трэба выкарыстаць усіх працаздольных калгаснікаў.

Будаўніцтва сьвінарнікаў патрабуе самай сур'ёзнай увагі з боку нашай грамадзкасьці. Трэба дабіцца, каб сьвінарнікі былі пабудаваны ў тэрмін.

К. І.

Статак калгасных сьвіней.

Койданаўскі РКС разваль вае сьвінагадоўчую фэрму

Калгас «Новае Жыцьцё», Койданаўскага раёну, мае ўсе ўмовы для арганізацыі добрай сьвінагадоўчай фэрмы.

Сьвіньні калгасу добра паваліся. Летась было толькі 18 матак. Дзякуючы добраму догляду, ад прыплоду гэтых матак варэз маецца разам са старымі 180 матак. Леташнія сьвіньні пачалі ўжо парасіцца. У калгасе зараз ёсьць 150 парасят веснавога апросу.

Да гэтага часу калгас адаў дзяржаве 15 галоў кормных сьвіней. Каб былі кармы, можна было-б зараз адкармліць і здаць яшчэ некалькі галоў сьвіней.

Бяда ў тым, што Райкалгассаюз ня толькі не дапамагае, але, наадварот, тармозіць разьвіцьцё сьвінагадоўлі. Ня гледзячы на тое, што калгас пабудаваў сьвінарнік, мае значнае матачнае стада, мае практыку ў разьвядзеньні сьвіней, што нават стаў прыкладам у гэтай галіне, для інш. сьвінагадоўчых гаспадарак—і ўсё-ж калгас чамусь-то мяркуюць ператварыць у малочную фэрму. Канцэнтраваных кармоў калгасу не даюць, падсосных матак і парасят няма чым падкормліваць.

Трэба сьпыніць гэтае абураючае разбурэньне амаль з'арганізаванай сьвінагадоўчай фэрмы, калгас «Новае Жыцьцё» павінен застацца сьвінагадоўчым. Сьвінаводцэнтр павінен умяшацца ў гэту справу дапамагчы калгасу працягваць далейшае замацаваньне.

К.

Пастанова калегіі Народнага камісарыяту земляробства БССР аб выкананьні плянаў па жывёлагадоўлі

Калегія Народнага камісарыяту земляробства БССР пастанаўляе:

1. Адзначыць што:

а) Тураўскі, Лепельскі, Пухавіцкі, Койданаўскі, Журавіцкі, Петрыкаўскі, Чэрыкаўскі, Асіповіцкі, Буда-Кашалёўскі, Круглянскі, Магілёўскі, Расонскі, Сіроцінскі, Гітускі, Дрысенскі, Касьцюковіцкі, Чырвона-Полыскі, Жлобінскі, Бялынічскі і Чавускі райсаветы ня выканалі пастанову калегіі Наркамзему аб давядзеньні плянаў па жывёлагадоўлі да саўгасаў, калгасаў і паасобных бяднацка-серадняцкіх гаспадарак у парадку самазабавязацельстваў і ў парадку цьвёрдага заданьня да кулацка-заможных гаспадарак і не прадставілі ў НКЗ даведзеных раённых плянаў па жывёлагадоўлі і захаваньні маладняку;

б) Гомельскі, Мазырскі, Бягомльскі, Церахаўскі, Вушацкі, Чашніцкі і Аршанскі райсаветы не прадставілі плянаў па сьвінагадоўлі;

в) плянавыя заданьні па жывёлагадоўлі скарочаны і ня выпраўлены ў адпаведнасьці з заданьнямі НКЗему наступнымі раёнамі: Клічаўскім, Жыткавіцкім, Прапойскім, Юравіцкім, Чачэрскім, Халопеніцкім і Дрыбінскім па буйна-рагатай жывёле і па сьвіньнях Полацкі, Чачвіцкі, Хоцімскі, Уваравіцкі, Лёзьненскі, Веткаўскі, Талачынскі, Менскі, Быхаўскі, Лельчыцкі.

За недапушчальна нядбайныя адносіны з боку райсаў да ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў па жывёлагадоўлі і за невыкананьне дырэктыў НКЗ абвясьціць вымову загадчыкам Тураўскага, Азарыцкага і Парыцкага райсаў. Прасіць райвыканкомы паказаных раёнаў абмяркаваць пытаньне аб магчымасьці застаўленьня ў далейшым на рабоце загадчыкаў райсаў і паведаміць Наркамзем да 30-VI—1931 году.

3. За непрадстаўленьне раённых плянаў па разьвіцьці жывёлагадоўлі паставіць на від загадчыкам райсаў Вушацкага, Койданаўскага, Дрысенскага, Лепельскага, Журавіцкага, Пухавіцкага і Глускага.

4. Папярэдзіць усіх астатніх загадчыкаў райсаў, якія ня выканалі заданьняў Наркамзему аб давядзеньні плянаў і ўтварэньня зьмен у раённых плянах па жывёлагадоўлі, што за непрыняцьце мер з іх боку да ажыцьцяўленьня вызначанага Нарказемам пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі яны будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Абавязаць загадчыкаў райсаў раёнаў пералічаных у п. п. «а» «б» і «в» прадставіць у НКЗ раённыя пляны па жывёлагадоўлі ў адпаведнасьці з заданьнямі Наркамзему да 25-VI 1931 году.

5. Заслухаць на працягу ліпеня месяца даклады 25—30 загадчыкаў райсаў аб выкананьні плянавых заданьняў па жывёлагадоўлі.

30-га чэрвеня заслухаць на калегіі даклады Журавіцкага, Койданаўскага, Пухавіцкага, Тураўскага райсаў аб выкананьні мерапрыемстваў па жывёлагадоўлі.

6. Абавязаць сэктар масавых кампаній і сэктар жывёлагадоўлі забясьпечыць зьмяшчэньне ў друку дэкадных зводак аб ходзе арганізацыі, камплектаваньні і здачы таварнай прадукцыі па МТКФ і СТКФ.

7. Папярэдзіць усе райсаў, што адказнасьць за выкананьне плянавых заданьняў па жывёлагадоўлі яны нясуць нарэўне з арганізацыямі, якія непасрэдна праводзяць гэту работу.

Народны камісар земляробства БССР Рачыцкі.

Толькі 16,5 проц. галоў сьвіней забясьпечана сьвінарнікамі

Будаўніцтва сьвінарнікаў па саўгасах «Сьвінаводу» разгортваецца марудна. А між тым, забясьпечаньне сьвіньней сьвінарнікамі—ёсьць неабходная ўмова для вырашэньня мясной праблемы.

Досыць сказаць, што на 1-е чэрвеня г. г. гадавы плян будаўніцтва матачнікаў па сьвінагадоўчых саўгасах выкананы на 21 проц., ізалятараў—на 9 проц., што забясьпечвае пастаноўку толькі 16,5 проц. галоў сьвіней.

Ёсьць яшчэ гаспадаркі, якія на 1-е чэрвеня зусім не пачалі будаўніцтва. Гэта—саўгасы Красьніца, Хальч, Набор, Мсьціслаўль, Прыбольле і Пратрэс. Ледзь пачата будаўніцтва па саўгасах Івань, Некрашы, «Молатава», «Калініна» і інш.

Нават тыя гаспадаркі, якія ідуць наперадзе па будаўніцтву, выканалі гадавыя пляны—Сьвіслач на 41 проц., Васільеўск—40 проц., Блонь—29 проц.

Гэтае пагражаючае становішча пры мушае зараз гаварыць, аб неабходнасьці фарсіраваць будаўніцтва. Цэнтральныя і мясцовыя арганізацыі павінны зьвярнуць на гэты вучастак сур'ёзную ўвагу, каб вызначаныя пляны будаўніцтва сьвінарнікаў былі выкананы поўнасьцю і сваячасова.

Г. Ш.

У бой за лён

У ТЭРМІН ПАДРЫХТАВАЦЬ ЗАВОДЫ

для апрацоўкі лёну і канапель новага ўраджаю

Сваячасова ўвесьці ў строй сацыялістычнай прамысловасьці новыя лёнаапрацоўчыя адзінкі

Будаўніцтва лёназаводаў—адказьнейшы і ўдарны вучастак работы—пад кантроль раённых партыйна-комсамольскіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый

Партыйна-савецкія і раённыя арганізацыі Вушаччыны павінны адказваць за пабудову лёназаводу ў раёне

(Ад нашага кар.).

Вушацкі раён з лёнаканапляводчым ухілам сельскай гаспадаркі. Для ажыцьцяўленьня гэтага тут яшчэ з красавіка распачата будаўніцтва лёназаводу.

Згодна плянаў, да 1-га ліпеня павінна быць скончана будаўніцтва галоўнага корпусу і ў кастрычніку завод павінен быць пушчаны ў ход. Аднак, тэмпы будаўніцтва на сёньняшні дзень нікольні не гарантуюць выкананьне гэтых плянаў.

Яшчэ ня толькі не распачата як належыць будаўніцтва, а нават і матар'ялы ня ўсе дастаўлены для першапачатковых работ.

Аднаго лесу павінна быць дастаўлена 273 кубамэтраў. Дастаўлена-ж толькі 73 кубамэтры. І гэта мы маем таму, што за лесаматар'ялам кожны дзень едуць адна-дзьве падводы, якія прывозяць па 2-3 кубамэтры бярвеньня.

Зразумела, каб вывесьці ўвесь патрэбны матар'ял такімі тэмпамі, неабходна ня менш як 70 дзён.

Ня лепш з дастаўкай і іншых матар'ялаў. Яшчэ не хапае вапны і цэменту. Дырэктар заводу за адной вапнай у Кублічы (20 кілёмэтраў адлегласьці ад заводу) езьдзіў 10 разоў і ўсё бяз толку—вапны не знаходзіў.

З рабочай сілай таксама дрэнна. Не хапае цесьляроў, нехапае іншых рабочых. Усяго рабочых працуе каля 24-х чалавек у той час, як для нармальнага ходу работы патрэбна ня менш 50. З наступленьнем уборкі ўраджаю лічба ў 24 чал. рабочых зьнізіцца ў два разы, а то і больш.

Для прыцягненьня рабочай сілы на будаўніцтва лёназаводу, патрэбна мак сымальна забясьпечыць яе прамтаварамі і прадуктамі. Аднак, райспажыўсаюз насустрач гэтаму ня ідзе, адносіцца да гэтага фармальна, ня лічыцца з важнасьцю будаўніцтва лёназаводу.

Лёназавод пры такіх умовах у тэрмін пабудаваны ня будзе. Аб гэтым гавораць паказаныя факты. Аднак, ён павінен быць пабудаваны.

Віну за зрыў будаўніцтва заводу трэба пакласьці ня толькі на адміністрацыю, але і на РВК, райком партыі, прафсаюзы, калегірацыю, а ў першую чаргу на райком партыі. Яны не садзейнічаюць адміністрацыі ў будаўніцтве лёназаводу, лічаць гэту справу далёкай ад сваіх абавязкаў, і ў выніку гэтага—пагроза зрыву пабудовы лёназаводу становіцца рэальнай.

Лёназавод павінен быць пабудаваны ў тэрмін. Таму будаўніцтва яго павінна прыкаваць да сябе увагу раённых арганізацый, якія павінны забясьпечыць скончэньне ў тэрмін гэтай пабудовы.

Брыгада «Сав. Бел.»: Карцель Ул. Каронік Ул.

Пабудаваць лёназавод на Расоншчыне

Будаўніцтва лёназаводу ў Расонскім раёне на сёньняшні дзень толькі пачало варушыцца. На пабудове яго працуе 22 чалавекі, але няма тэхкіраўніцтва. Плян будаўніцтва ня выканан і на 1 проц.

Загатоўлена і вывезена толькі 423 куб. мтр лесаматар'ялу, што складае 50 проц. агульнай патрэбнасьці. Камня загатоўлена 200 куб. мтр., што складае 85 проц. пляну, але камень на месца пабудовы не дастаўлены. Плян загатоўкі пяску выкананы на 70 проц. Шчапы загатоўлена 32.000 штук замест 941.000. Цэглы ёсьць 50.000 штук, а патрэбна 104.000.

Наглядаецца няўмелае разьмеркаваньне рабочай сілы і фурманак па асобных будаўнічых арганізацыях, што шкодзіць сваячасовай дастаўцы будаўнічых матар'ялаў на месца пабудовы заводу.

Сельсавет да гэтага часу ня мае пэўнае думкі пра тое, дзе будзе будавацца завод. Вышэйшыя арганізацыі не прысылаюць тэхкіраўнікоў.

Будаўніцтва гэтага заводу падпарадкуецца па першае Галоўлёнкому, па другое начальніку Віцебскай будаўнічай групы, па трэцяе Маскоўскаму Лёнаканаплябуду.

Але ўсе гэтыя арганізацыі на сёньняшні дзень ня ведаюць, што робіцца на Расонскім лёназаводзе.

А між тым сялянства і калгасьнікі спадзяюцца, што завод будзе пабудаван да восені гэтага году, што лён можна будзе здаць на завод для апрацо

Ліквідаваць абязьлічку ў камунальнай гаспадарцы

Прапануем арганізаваць т-ва садзейнічаньня міліцыі

Камунальная гаспадарка адстае ад апульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, што часем цяжка ўплывае на дабрабыт рабочае класы. Гэта ведамі выразна адзначыў Чэрвенскі пленум [illegible], як [illegible] перад усёй партыйнай сэкцыяй, прафсаюзнай грамадзкасьцю, перад кожным працоўным адказьнейшую задачу: як мага хутчэй ліквідаваць адставаньне камунальнай гарадзкой гаспадаркі, каб з «вузкага месца» яна ператварылася ў перадавы вучастак нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Камунальная гарадзкая гаспадарка Менску пакуль што—«вузкае месца». Дастаткова паглядзець на атульны выгляд гораду, каб гэта стала зусім яскравым. Вуліцы пастаянна ўзарыты, тратуары паламаны, ямы, равы, песпарадачны рух, бруд, сьцены дамоў аблеплены кавалкамі афіш, плякатаў, вялікімі аблаўнымі шыльдамі. Усё гэта сьведчыць аб тым, што дабрабыт Менску патрабуе самай значнай увагі грамадзкасьці.

Вось прыклады абураючага галавацяпства. ЖАКТ № 5 вывозіць бруд з сваіх двароў на ваколіцу гораду і кідае яго ля чыгуначнага шляху і будынкаў.

Толькі, толькі забрукавалі Камуністычную вуліцу, як раптам зьявіўся прадстаўнік кіраўніцтва сувязі і патрабуе дазволу зноў яе капаць для пракладкі тэлефоннага кабелю.

Такі-ж выпадак меў месца і на Савецкай вуліцы, дзе Эльвод бяз усякага дазволу пачаў капаць катаву для электрычнага кабелю.

Але ўсё-ж гэта нішто ў параўнаньні з тым, як некаторыя ЖАКТ'ы «паляпшаюць» санітарнае становішча. У доме № 55 па Савецкай вуліцы правяліся далучэньне да каналізацыйнай сеткі. Скончылі работу. Уборная на дварэ ўжо непатрэбна ,але ачысьціць яе трэба. Замест гэтага робіцца так: нечыстоты ня вывозяцца, а... закопваюцца ў зямлю (?!)

Зусім натуральным вынікам гэткага і да яго падобнага злачынага галавацяпства, зьяўляецца тое, што аналізы Менскай глебы даюць вельмі дрэнныя паказчыкі, што на глыбіні 25 мтр. вада вельмі дрэнная, што на працягу шмат год Менск перажывае цяжкія эпідэміі брушнога тыфу.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што камунальная і гарадзкая гаспадарка Менску яшчэ ня мае належнага кіраўніцтва і кантролю, што ў разгортваньні камунальнага будаўніцтва панае бясплянавасьць.

У камунальнай і гарадзкой гаспадарцы яшчэ існуе абязьлічка. Няма адказных за санітарнае становішча вуліц, дамоў, двароў.

Гэтую абязьлічку неабходна ліквідаваць. Кожны двор, кожны дом, кожная вуліца павінна мець свайго гаспадара, які-б штодзённа сачыў за іх становішчам і адказваў за яго.

20-га чэрвеня пачаўся абвешчаны Менгаркомам, партыі і Менгарсаветам **двухдэкадзнік палепшаньня санітарнага становішча і дабрабыту Менску.** Мэтай двухдэкадніка—**на працягу гэтага часу да дню сьвяткаваньня XI гадавіны аслабаненьня Беларусі ад бела палякаў, прывесьці Менск у належны выгляд.**

У часе двухдэкадніка будуць ачышчаны ўсе вуліцы і двары Менску, адрамонтаваны і афарбаваны дамы. З фасадаў павінны быць зьняты вялікія, агідныя і нікому непатрэбныя шыльды, якія займаюць значную частку сьцен. Замест іх будуць зроблены новыя стандартныя, прыгожыя шыльды, а бляха старых скарыстаецца на урны для сьмецьця, якія будуць пастаўлены ля кожнага дому.

Менгарсавет абвесьціў абавязковую працоўна-гужавую павіннасьць для мабілізацыі коннага і аўтатранспарту на ачыстку двароў і вуліц. Гэта мера прыемства дасягне сваёй мэты толькі тады, калі транспарт будзе належным чынам і плянава скарыстаны. Гэта па-рабуе ад Гаржылсаюзу, жактаў, і інш. зрганізацый максымальна чоткай работы. **За кожную хвіліну непатрэбнага прастою транспарту трэба бязьлітасна карань.**

Другой галоўнай задачай двухдэкадніка зьяўляецца тое, каб жакты, не спадзяючыся цалкам на транспарт і будматэрыялы, якія яму будуць прадастаўлены Гаржылсаюзамі, мабілізавалі ўсе свае ўнутраныя рэсурсы і ў тэрмін скончылі ачыстку, рамонт, афарбоўку, пракладку тратуараў і г. д.

Зразумела, што двухдэкадзік дасягне сваёй мэты толькі пры ўмове ўдзелу шырокіх мас працоўных. **Жакты павінны зараз-жа разгарнуць шырокую растлумачальную работу. Кожны рабочы, служачы, кожны працоўны павінен аддаць адзін выхадны дзень на ачыстку гораду.**

Арганізацыяй суботнікаў, ачысткі гораду, адкажам на пастанову Менгаркому партыі і Менгарсавету аб упарадкаваньні санітарнага становішча чырвонай сталіцы Савецкай Беларусі.

Для дапамогі міліцыі ў справе нагляду за санітарным становішчам, камунальнай і гарадзкой гаспадарцы і дабрабыту, барацьбы з хуліганствам, **мы прапануем: арганізаваць у БССР Таварыства садзейнічаньня міліцыі.**

С. Гр-аў.

Пачынаецца справаздачна-праверачная кампанія Віцебскага гарсавету

У мэтах выкананьня наказаў аб правядзеньні справаздачы дэпутатаў гарсавету перад сваімі выбаршчыкамі кожныя 3 месяцы, Віцебскі гарадзкі савет, выходзячы з пастановы Сакратарыяту гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму гарсавету, праводзіць у Віцебску справаздачную кампанію гарсавету.

У сваёй пастанове па гэтым пытаньні гарком партыі адзначае, што справаздачная кампанія, павінна прайсьці як палітычна масавая, вакол якой павінна быць мабілізавана думка ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, падрыхтоўку да ўборкі, 100 проц. рэалізацыю пазыкі «3-ці рашаючы» з ахопам усіх працоўных і шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Гэта кампанія павінна таксама пайсьці пад знакам праверкі работы дэпутатаў гарадзкога савету і прымацаваных. Сходы павінны быць забясьпечаны 100-процантнай яўкай.

Гарком прапануе усім партыйным калектывам і ячэйкам, фракцыям ФЗМК, гарсавету, гарпрафсавету забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне справаздачнай кампаніі гарсавету і мабілізаваць вакол яе усю пралетарскую грамадзкасьць. **Н. Дварсон і Міркін.**

Прэзыдыум Менгарсавету не рэагуе на зрыў работы сэкцый

Райкалгассаюз, Ахматмлад і Гар'інспэкцыя нарасьветы ігнаруюць работу сэкцыі быту Менгарсавету. Некалькі разоў вышэйпаказаныя ўстановы выклікаліся як на пленум, так і на бюро бытавой сэкцыі гарсавету для дакладаў аб летняй ясельнай кампаніі. Сэкцыя з свайго боку прыняла ўсе захады для дапамогі ў разгортваньні ясельнай кампаніі, даслала брыгады з дэпутатаў у прыгарадныя сельсаветы, па гарадзкіх ясьлях і г. д. Райкалгассаюз ужо чатыры разы сваёй няўкай на бюро і на пленум зрывае работу. Аб гэтым было даведзена прэзыдыуму гарсавету, але і з яго боку на гэта ня было зьвернута належнай увагі.

Неабходна праверыць як Менгарсавет выконвае пастанову пленуму гаркому КП(б)Б аб разгортваньні масавай работы савету.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

Пастанова Эканамічнага Савету БССР

ПРА ХОД ПАДРЫХТОЎКІ ДА СІЛАСАВАНЬНЯ.

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Земляробства БССР пра ход падрыхтоўкі да сіласаваньня кармоў і будаўніцтва траншэй, ям і сілосных вежаў,—Эканамічны Савет адзначае, што ня гледзячы на тое, што сіласаваньне кармоў зьяўляецца адным з галоўнейшых мерапрыемстваў для забясьпечаньня на стойлавы перыяд жывёлы кармамі, асабліва сацыялістычнага сэктару, цэнтральныя і раённыя арганізацыі і ўстановы не ўжылі належных захадаў да падрыхтоўкі і выкананьня праграмы сіласаваньня бягучага году і зусім недапушчальна ад несьліся да будаўніцтва новых ям і траншэй, а таксама да рамонту і прыстасаваньню старых.

Будаўніцтва стандартных сілосных веж на заводах Лесбелу праходзіць зусім неадавальняюча.

Сілоснае будаўніцтва не забясьпечана мясцовымі будаўнічымі матарыяламі, а таксама тымі, якія павінны быць завезены (цэмэнт, толь і інш).

Асноўнай прычынай вышэйпамянёнага зьяўляецца зусім недастатковае ўцягненьне ў справу выкананьня пляну сіласаваньня шырокай грамадзкасьці—рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бедняцка-серадняцкай масы сялянства і недастатковае асьвятленьне ў цэнтральным і асабліва ў мясцовым друку ходу падрыхтоўкі сілосных кампаній і непапулярызацыя сярод шырокіх мас калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства станоўчых вынікаў сілоснай кампаніі мінулага году.

Для зьнішчэньня вышэйпаказаных недахопаў і для забясьпечаньня выкананьня пляну сіласаваньня кармоў—Эканамічны Савет БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць усіх дырэктароў сельска-гаспадарчых трэстаў, Балжаансаюз Белхлебжывёлсаюз, Белкалгасцэнтр і старшынь раёных выканаўчых камітэтаў неадкладна прыступіць і поўнасьцю выканаць устаноўленыя Народным Камісарыятам Земляробства па сыстэмах і раёнах пляны сіласаваньня.

2. З тае прычыны, што асноўная і пераважная маса (ў сярэдніх 85-90 пр.) сіласу ў гэтым годзе будзе эканомлена ў ямы і траншэі, прапанаваць усім гаспадарчым сыстэмам і раённым выканаўчым камітэтам зараз-жа распачаць будаваньне патрэбнай колькасьці і ёмкасьці ямы і траншэі, паставіўшы гэту працу першачарговай і ўдарнай.

3. Прапанаваць Белсельбуду, пад асабістую адказнасьць т. Сьліўкіна, на працягу трох дзён вылучыць для працы па сілоснаму будаўніцтву ня менш трох асоб, на якіх усклясьці арганізацыйна-інструктарскія абавязкі і аказаньне саўгасам і калгасьным гаспадаркам патрэбнай тэхнічнай дапамогі, а Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белжалгасцэнтру, сельска-гаспадарчым трэстам і раённым выканаўчым камітэтам забясьпечыць належны інструктаж з боку агранамічнага і будаўнічага пэрсаналу.

4. Абавязаць дырэктароў Лесбела, Бабруйскага Дрэваапрацоўчанага Камбінату, Гомсельмаша, Магілёўскага заводу «Чырвоны Адраджэнец» пад іх асабістую адказнасьць забясьпечыць выкананьне па ўстаноўленым тэрміну вырабу сілосных веж і сіласарэзак, ліквідаваўшы безадказнае маючыяся пра рывы.

Прапанаваць дырэктару «Белсельгаспснаба» т. Талапіла пад яго асабістую адказнасьць забясьпечыць своячасовую дачу разнарадак і своячасовае адгрузьць це веж і сіласарэзак.

5. Прапанаваць Дзяржпляну забясьпечыць сілоснае будаўніцтва будаўнічымі матар'ялам, а Белсельгассаюзу своячасова забясьпечыць адгрузку патрэбных будаўнічых матарыялаў у пункты будаваньня сілосных вежаў.

6. Улічваючы недахоп пасеваў сілосу і шырокую магчымасьць скарыстаньня пустазельля, балотных траў, бульбяніка, атавы і інш. разгарнуць шырокую працу па максымальным скарыстаньні гэтай масы для сіласаваньня.

Прапанаваць усім цэнтральным гаспадарчым арганізацыям і раённым выканаўчым камітэтам мабілізаваць увагу усіх прамадзкіх арганізацый, камсамолу, піянэрскіх арганізацый, рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, калгасьніц бядняцка-сераднякцкім мас сялянства на пытаньні будаўніцтва ям і траншэй, на выкананьне пляну сіласаваньня кармоў, разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва за своячасовае і поўнае выкананьне будаўніцтва і сіласаваньня.

7. Улічваючы шырокія магчымасьці скарыстаньня ў БССР ветачнага корму, прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белкалгасцэнтру, сельска-гаспадарчым трэстам, Белкаапсаюзу і раённым выканаўчым камітэтам разгарнуць масавую працу па ўжываньню ветачных кармоў, своячасова правёўшы вопыт сіласаваньня ветачных кармоў.

8. Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і мясцовых газэт больш шырока асьвятляць ход падрыхтоўкі да сіласаваньня.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белкалгасцэнтру, Белдзяржвыдавецтву забясьпечыць выпуск належнай колькасьці папулярнай літаратуры па сіласаваньні і будаўніцтве ям і траншэй.

Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, Белкалгасцэнтр і раённыя выканаўчыя камітэты скончыць падрыхтоўку кадраў па сіласаваньні не пазьней 15-га ліпеня г. г.

10. Нагляд за ходам будаўніцтва па сіласаваньні ўсклясьці на намесьніка Народнага Камісара Земляробства БССР т. Масюкова.

11. Даручыць т. Масюкову праверыць ход падрыхтоўкі да сіласаваньня і далажыць аб гэтым Камісіі Выкананьня пры СНК БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
М. Галадзед.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР
С. Кандыбовіч.

8 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова Камісіі Выкананьня пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра выкананьне дырэктыў па правядзеньні лесасплаву 1931 году

Выслухаўшы і абгаварыўшы даклад загадчыка сэктару Лесасплаву Лесбела т. Сукала і садклад прадстаўніка НК РСІ т. Крачэнка аб выкананьні пастаноў СНК за 18-IV і 3-V—31 г. і Эканамічнага Савету БССР за 28-IV—31 г. аб лесасплаве у 1931 г., Камісія Выкананьня адзначае што:

а) з прычыны непрыняцьця Лесбелам і у прыватнасьці загадчыкамі сэктараў лесаэкспарту т. Рэсіна і лесасплаву т. Сукала і загадчыкамі сплаўных кантор належных захадаў да выкананьня дырэктыў Ураду ад сплаве—сплаў праходзіць зусім неадавальняюча і сучасныя тэмпы сплаву (на 1 чэрвеня падвезена да прыстаней 50,3 проц. і вьявзана і спушчана на воду 29,7 проц. усяго аб'ёму сплаву) не забясьпечваюць своячасовага выкананьня пастановы СНК БССР аб выкананьні да 15 ліпеня 75 проц. усяго аб'ёму сплаву і сканчэньня яго цалкам да 1 кастрычніка;

б) плян сплаву складзен Лесбелам са значным спазьненьнем і не абгаворваўся на сходах рабочых;

в) Лесбелам ня складзен плян рацыяналізацыі і мэханізацыі сплаву і вывазкі лесу і да гэтага часу не праведзена амаль ніякіх мерапрыемстваў у гэтай галіне, а сабекошт сплаву па окладзенаму Лесбелам прамфінпляну ня толькі не зьніжаецца, а наадварот павялічаецца;

г) не наладжана ўкараненьне сацыялістычных мэтадаў работы на сплаве і культурна-выхаваўчая работа сярод сплаўшчыкаў;

д) вучот і кантроль забясьпечаньня сплаўшчыкаў прадуктамі харчаваньня і прамысловымі таварамі знаходзіцца ў нездавальняючым стане і ёсьць выпадкі няправільнага завозу і разьмяркаваньня фондаў снабжэньня лесасплаву на вучастках, разбазарваньня іх спажывецкай кааперацыяй (Бабруйск) і перавыдаткаваньня пасобнымі вучасткамі;

е) Лесбел не зьвярнуў належнай увагі на справу ўкамплектаваньня апарату сплаву, у выніку чго Леопрамгасы своячасова вылучалі супрацоўнікоў для сплаву, а вылучаныя супрацоўнікі не заўсёды адпавядаюць свайму прызначэньню;

ж) рабочая сіла, дзяжуючы арганізацыйным непаладкам (недахоп гужбы, снасьцей, і інш.) скарыстоўваецца на паасобных вучастках нерацыянальна. Брыгадным мэтадам работы ахоплена толькі 40 проц. занятых на сплаве рабочых. Усё гэта, у сувязі з недавядзеньнем гаспадарчага разрахунку да прыстаняй, і рабочых брыгад паглыбляе недахоп рабочай сілы на сплаве;

з) Лесбелам, оплаўнымі канторамі і раённымі выканаўчымі камітэтамі ня былі ўжыты належныя захады да своячасовага адпаўленьня і рамонту разбураных паводкай грэблей і зьняцьця з поймы уплыўшай у час паводкі драўніны, а таксама мелі месца моманты очкавуфіцельства і утойваньне зьвестак аб уплыўшай драўніне (Якшыцы).

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Камісія Выкананьня пастанаўляе:

1. Абавязаць Лесбел, пад адказнасьць т. т. Міленькага і Сукала;

а) да 20 чэрвеня скласьці каляндарны падэкадны плян сплаву, а таксама пляны рацыяналізацыі і мэханізацыі сплаву і да 25 чэрвеня абгаварыць гэтыя пляны на сходах рабочых;

б) верасклясьці прамфінпляны, зьнізіўшы у ім сабекошт сплаву ў гэтым годзе на 4 проц. і давесьці гаспадарчы разрахунак да вучасткаў, прыстаней і рабочых брыгад;

в) разам з раённымі выканаўчымі камітэтамі ўжыць захады да хутчэйшага сканчэньня набудовы і рамонту грэблю і прапускоў на сплаўных рэках, сарваных і пашкоджаных паводкаю, а таксама да пабудовы часовых грэблю;

г) неадкладна скончыць рамонт мотафлёту, развозку гужбы і такелажу і інш. і прыняць захады да забясьпечаньня загрузкі суднаў Дзяржфлёту і поўнага скарыстаньня замацованай за сплавам рабочай сілы;

д) не пазьней 20 чэрвеня скончыць укамплектаваньне апарату сплаву;

е) арганізаваць збор уплыўшай у час паводкі драўніны і прыцягнуць да адказнасьці работнікаў сплаўных кантор, якія утойвалі зьвесткі аб уплыўшай драўніне.

2. Прапанаваць Лесбелу разам з ЦП Саюзу лесдрэўрабочых, разгарнуць масавую работу па ўкараненьні сацыялістычных мэтадаў работы на сплаве і ўзмацніць культурна-выхаваўчую работу сярод сплаўшчыкаў.

3. Даручыць Лесбелу пад адказнасьць т. Сукала і Белкаапсаюзу пад адказнасьць т. Кліоцкага арганізаваць сталы вучот і кантроль забясьпечаньня оплаўшчыкаў харчамі і прамысловымі таварамі, і прыцягваць да адказнасьці вінаватых у разбазарваньні і перавыдаткаваньні фондаў снабжэньня неадкладна пасьля выяўленьня гэтых фактаў.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **А. Калнін.**

Сакратар Камісіі Выкананьня
Я. Элькін.

10 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

ПА БССР

Упарадкаваць кантроль і абсьледчыя работы

(АД ЦКК НК РСІ БССР).

У парадку выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па барацьбе з множнасьцю кантролю, ЦКК НК РСІ БССР прапануе ўсім дэяржаўным установам і прадпрыемствам, кааперацыйным і прамадзным арганізацыям рэспубліканскага значэньня не пазьней 26 чэрвеня г. г. падаць у НК РСІ БССР пляны абсьледчых работ (выезадаў) на III кварт. г. г. паводле пастановы Калегіі НК РСІ БССР, ад 24-III, п. 8 зьмешчанай у газ. «Савецкая Беларусь» № 69, ад 26-III-31 г. і інструкцыі НК РСІ БССР аб выкананьні пастановы СНК БССР ад 23-III-31 г., пра скарачэньне выдатку на камандыроўкі і абсьледчыя работы у 1931 г., надрукаванай у газ. «Савецкая Беларусь» № 75, ад 2-IV-31 года.

Пляны зьезадаў і нарад скласьці на ўвесь 1931 г. і падаць у НК РСІ БССР не пазьней 1-га ліпеня г. г.

Старшыня ЦКК КП(б)Б і Нарком РСІ БССР Калнін.

Чарговы пленум Вышэйшага Савету Фізкультуры

28 чэрвеня а 6 гадзіне ўвечары у памяшканьні ЦСПСБ (зала паседжаньняў) адчыніцца чарговы Пленум Вышэйшага Савету Фізкультуры БССР, з наступнай абвесткай дня:

1. Даклад ВСФКБ аб становішчы фізкультурнага руху ў БССР і яго чарговых задач, (дакл. т.т. Рыжкоў і Траскоўскі).

2. Даклад ВСФК СССР і БССР, аб перабудове навучальна-мэтадычнай і спартыўна - тэхнічнай работы (дакл. прадстаўнікі ВСФК СССР і БССР).

3. Нацыянальнае пытаньне ў фізкультурным руху.

4. Аб фізкультурным паходзе ў вёску і спартакіядзе калгасаў ,саўгасаў і МТС.

Падрыхтаваць загатоўча-засолачныя пункты

Набліжаецца кампанія загатоўкі грыбоў усіх відаў, але загатоўчыя арганізацыі Горацкага, Дрыбінскага, Расьнянскага і Мсьціслаўскага раёнаў, пры яўшы пляны, не пачынаюць падрыхтоўкі да выкананьня іх.

Ні райкаапсаюзы, ні райсаюзы яшчэ не арганізавалі ніводнага прыёмачна-адпраўнога пункту для загатоўкі і засолкі грыбоў. Старшыня Дрыбінскага райсаюзу заявіў, што загатоўкаю грыбоў ён займацца ня будзе, бо няма на гэта сродкаў.

Такія адносіны да загатоўкі грыбоў сыгналізуюць, што пляны загатоўкі грыбоў могуць быць сарваны таксама, як сарваны пляны загатоўкі смарчкоў.

Неабходна загатоўчым арганізацыям прачнуцца і падумаць аб падрыхтоўцы да загатоўкі грыбоў.

Жураўлёў.

10-цігодзьдзе Віцебскага яўрэйскага пэдтэхнікуму

У хуткім часе спаўняецца 10 год існаваньня Віцебскага яўрэйскага пэдтэхнікуму. За 10 год свайго існаваньня Віцебскі яўрэйскі пэдтэхнікум даў культурнаму фронту 300 чырвоных пэдагогаў, узброеных марксыцка-ленінскімі мэтадамі работы.

Калегія Наркамасьветы БССР адзначаючы вынікі дасягненьні Віцебскага яўрэйскага пэдтэхнікуму, як вынік яўкі пранадзяньня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі пастаніла правесьці ў Віцебску сьвяткаваньне юбілею, прыцягнуўшы да ўдзелу ў ім усе пралетарскія і грамадзкія арганізацыі.

Калегія НКА абвясьціла падзяку дырэктару тэхнікуму тав. Калескаму за адданую работу па падрыхтоўцы пралетарскіх пэдкадраў.

Апроч таго, калегія НКА адзначыла таксама адданасьць усяго пэдагагічнага калектыву тэхнікуму і вітае пэдагогаў і студэнцтва з 10-цігадовым юбілеем.

Узмацніць тэмпы сяўбы

Вяснавая сяўба ў прыгарадных сельсаветах Віцебшчыны праходзіць нездавальняюча. На 7 чэрвеня плян сяўбы выканан на 71,7 проц., пры чым асабліва адстае ў сяўбе аднаасобнага сэктар. Гэта паказвае, што Гарсавет і сельсаветы недастаткова разгарнулі работу па правядзеньні веснавой сяўбы і слаба кіруюць гэтай справай.

Праўда, калектывізацыя ў гэтых сельсаветах праходзіць досыць пасьпяхова (зараз калектывізавана на 51 проц. бядняцка-сераднякцкіх гаспадарак), але веснавая сяўба адстае.

Прыгарадныя сельсаветы павінны рэзучча ўзмацніць тэмпы веснавой сяўбы і адначасова павесьці актыўную падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю.

Брыгада «Сав. Бел.» Дварсон, Міркін.

Трывожныя сыгналы з магілеўскіх пабудоў

Тэмпы будаўніцтва, якое праводзіцца Магілеўскім аддзяленьнем Белрэсбудканторы, далёка нездавальняючыя.

Галоўнай перашкодай у будаўніцтве зьяўляецца: адсутнасьць вапны, што пагражае спазьненьнем некаторых відаў работ. З боку заказьнікаў назіраецца сыстэматычнае неўпясьненне Рэсбудканторы належных грошай на будаўніцтва—на 28-V—31 г.

Маецца запазычанасьць у 522.700 р.

Гэткае становішча з працыма не дае магчымасьці своячасова выкупаць буд матар'ялы. Адсюль маюць месца прастоі вагонаў з матар'ялямі і сыстэматычная зацяжка ў выплаце заработку рабочым.

У адносінах забесьпячэньня будаўніцтва рабочай сілай таксама маецца рад ненармальнасьцяй. НКП БССР дае нарад на вярбоўку каменшчыкаў у Шклоўскім раёне, у Чачэвіцкім штукатураў у той час калі гэтых кваліфікацый у памянёных раёнах ніколі ня мелася. З боку Магілеўскага сэктару кадраў назіраюцца чыста бюракратычныя адносіны да справы ў дапамозе па вярбоўцы рабочай сілы.

— Выдаў нарад, а апошняе мяне не датычыцца!—так адказвае сэктар кадраў. (Гэта замест практычнай дапамогі).

Сярод маючыхся ў наяўнасьці рабочых наглядаецца вельмі вялікая цякучасьць, якая тлумачыцца сыстэматычнай зацяжкай ў выплаце заработку і дрэнным снабжэньнем прадуктамі харчаваньня з боку ЦРК.

Маюць месца выпадкі, калі прыехаўшыя з другіх раёнаў рабочыя на 20 дзён акрамя хлеба нічога не атрымлівалі, гэткае зьявішча можна тлумачыць чыста бюракратычнымі адносінамі з боку некаторых работнікаў ЦРК да справы забесьпячэньня будаўнікоў-сэзоньнікаў. Такі выпадак меў месца з 15 конных грабарамі і 55 каменшчыкамі.

Сацспаборніцтва на будаўніцтве зусім не разгорнута, культмасавая і выхаваўчая работа адсутнічае, рабочкомы і ячэйка КП(б)Б гэтай справай зусім ня цікавяцца. Кіраўніцтву Рэсбудканторы і належным органам трэба зараз-жа прыняць рад мерапрыемстваў па зьнішчэньні паказаных недахопаў і гэтым самым напярэдзіць зрыў будаўніцтва.

Хоміч.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

24-VI-31 г., а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні ЦК КП(б)Б (м. заяя) адбудзецца нарада ўпаўнаважаных ЦК і СНК па пасеўкампаніі.

Сакратар Агітмас. Аддз. Путырская.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Дзярж-ЦЫРК

Сёньня гастролі нямецкага атракцыёну)-6 РЭДАМ 6-(
Лётаючыя самалёты
на жывым п'едэстале.
5 торнэо—турністы Дуо Сержэ—Ікар. гульні
Пачат. а 8 г. 45 х. увечары
Льготныя білеты ў рабкасе

„Чырвоная Зорка" — Амэрыканская камэдыя Малодшы сын у 8 частках у галоўнай ролі Гарольд Лёйд. Пачатак а 7 гадз. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура" — Новы фільм вытворчасьці Саюзкіно Чорныя дні. Звыш праграмы замежная камэдыя БРАДЗЯГА Чарлі Чаплін. Пачатак а 7 гадзіне.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Замежны фільм Трагэдыя акрабата. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" — Новы савецкі фільм Сакрэт Рапіда (Драма ў 6 част.) Луі ў раю—у 3 част. (Гарольд Лёйд) Пачатак а 1 сэансу а 2 гадз. дня.

Прыступаючы да прамысловай разьведкі жалезных руд У БССР,
Горна-Разьведчае кіраўніцтва ВСНГ БССР
просіць усе партыйныя, савецкія, грамадзкія арганізацыі, калгасы, саўгасы і ўсё працоўнае насельніцтва БССР і асабліва Гомельскага, Церахоўскага, Брагінскага, Юравіцкага, Жлобінскага, Рагачоўскага, Клімавіцкага, Крычаўскага, Прапойскага, Рэчыцкага, Лоеўскага, Хойніцкага, Чэчэрскага, Парыцкага, Бабруйскага, Сьвіслацкага і Бярэзінскага раёнаў
АКАЗАЦЬ САДЗЕЙНАСЬЦЬ
горна-разьведачным партыям і атрадам па адшуканьні месцазнаходжаньня жалезных руд
ШЛЯХАМ ВУСНАГА ПАВЕДАМЛЕНЬНЯ
праходзячым па тэрыторыі калгасаў і вёсак
ПАШУКОВЫХ АТРАДАЎ
і пісьмова па адрасе: 1) Менск, Пляц Волі, Горна-Разьведачае кіраўніцтва ВСНГ БССР. 2) Гомель, Віцебск, Магілеў, Церахоўка, Крычаў, Хойнікі—горна-разьведачныя партыі.
ГРК ВСНГ БССР

Беларускі Дзяржаўны ІНСТЫТУТ ПРАДЗІЛЬНЫХ КУЛЬТУР
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
(колькасьць 100 асоб).
Заявы прымаюцца да 1 жніўня. Іспыты—з 15 па 25 жніўня. Заняткі пачнуцца з 1 кастрычніка 1931 г.
Падрабязныя правілы прыёму—у даведніку НКА. Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасе: БССР, г. Горкі, Інстытуту Прадзільных Культур.
1—2 Дырэктар інстытуту Брытаў.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ БУЙНАЙ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ (У ГОРКАХ)
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
на першы курс інстытуту, на аддзяленьні: 1) Буйнай рагатай жывёлы, 2) Завочнай гаспадаркі.
Падрабязныя правілы прыёму абвешчаны ў абежніку НКА.
Прыём заяў праводзіцца да 1 жніўня. Іспыты праводзяцца з 15 па 25 жніўня. Заняткі пачнуцца з 1 кастрычніка.
Заявы падаваць на імя прыймовай камісіі інстытуту буйнай рагатай жывёлы—г. Горкі. БССР. У заяве абавязкова пазначыць указаньне аддзяленьне, на якое падаўшы заяву жадае паступіць.
1—2 Дырэкцыя.

Беларускі Дзяржаўны Інстытут Сьвінагадоўлі
Беларускі Дзяржаўны Інстытут СЬВІНАГАДОЎЛІ
АБВЯШЧАЕ
АСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
ПРЫЁМ ЗАЯЎ жадаючых паступіць у Інстытут утвараецца да 15 жніўня 1931 г. іспыты—з 15 жніўня па 1 верасьня г. г.
Заняткі пачнуцца з 1 кастрычніка.
Інстытут арганізаваны на базе сьвінагадоўчага факультэту Зоаінстытуту і з 1 студзеня 1931 г. будзе знаходзіцца ў г. Менску.
Прыём утвараецца ў г. Горках.
Падрабязныя правілы прыёму ў даведніку НКА БССР для паступаючых у ВНУ. Заявы з дакумантамі накіроўваць па адрасу: г. Горкі. БССР, Інстытуту Сьвінагадоўлі.
1—3 Нам. Дырэктара Інстытуту Лемеш.

Беларускі Дзяржаўны Інстытут кармовых культур і аграхэміі
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
на аддзяленьні: 1) кормаздабываньня, 2) збожжавых культур, 3) аграхэміі з глебазнаўствам, 4) сенажацяй і пашаў
(колькасьць 160 асоб)
Заявы прымаюцца да 1 жніўня.
Іспыты праводзяцца з 15 па 25 жніўня.
Заняткі пачынаюцца з 1 кастрычніка 1931 г.
Падрабязныя правілы прыёму ў даведніку НКА.
Заявы з паказаньнем аддзяленьня і адпаведнымі дакумантамі накіроўваць па адрасе: БССР. г. Горкі, Інстытуту кармавых культур і аграхэміі.
Дырэктар інстытуту С. Буткевіч.

З дапамогай пралетарскай грамадзкасьці зьнішчым недахопы па дастаўцы друку працоўным Менску.
22 чэрвеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу сувязі (Ленінская 34, за дварэ)
АРГАНІЗОЎВАЕЦЦА ВЕЧАР „ЗА ЧАШКАЙ ЧАЯ"
вечар сустрэчы калектыву Менгазбюро—газэтаносцаў з падпішчыкамі і грамадзкімі распаўсюджвацелямі друку па пытаньні:
1) Аб якасьці дастаўкі друку па Менску.
2) Далейшае мерапрыемства па палепшаньні ў дастаўцы друку.
На вечар таксама запрашаюцца наступныя т. т.
ад гарсавету т. Бяркоўскі, ад Гаркома партыі—Куліненка, Герчыкаў, ад гаржылсаюза—Гальперын, ад Гарпрафсавета—Хопік, ад рэдакцыі газэт прадстаўнікі, ад ЦП саюзу сувязі—Дамброўскі і Жалезьняковаў, ад партколектыву сувязі—Наўмёнак, ад кіраўніцтва сувязі—Дубіна, Анташэўскі і Ізраілевіч.
Рабочком Менскай п.-т. канторы пры Менгазбюро.

КАНТОРА „БЕЛГАНДАЛЬ" ПЕРАМЯСЬЦІЛАСЯ па Савецкай, 57
„БЕЛГАНДАЛЬ"

ВАСІЛЕВІЦКІ ЛЕСПРАМГАСВУЧ
АБВЯШЧАЕ ЛЕТНІ НАБОР
на 1-шы курс лесанарыхтоўчага аддзяленьня.
Школа рыхтуе ніжэйшы адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал для лясной гаспадаркі. Скончыўшыя школу будуць прымацаны ў ВНУ, пасьля 2-хгадовай працы на вытворчасьці
ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ—2 ГАДЫ.
Да заяў далучаюцца наступныя дакументы (абавязкова ў арыгінале).
1. Аб адукацыі (пасьведчаньне аб скончаньні 7-годкі, ШКМ).
2. Аб узросьце (мэтрыка).
3. Мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага.
4. Анкета, засьведчаная партыйнымі, прафэсыянальнымі альбо савецкімі установамі.
5. Даведка аб карыстаньні бацькоў выбарчымі правамі.
6. Для сялян—акладны ліст альбо засьведчаная копія яго аб падатку на 1930-31 год, а для саматужнікаў—адпаведны дакумант аб падатку на 1931 год.
7. Дакумант, які сьведчыць аб сацыяльным і матар'яльным стане паступаючага і яго бацькоў да рэвалюцыі і пасьля рэвалюцыі.
8. Дзьве фатаграфічныя карткі.
Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 16 і не вышэй 19 год.
Прыём з яў будзе праводзіцца ў канцэлярыі школы (ст. Васілевічы, Рэчыцкага раёну, Леспрамгасвуч з 20 чэрвеня да 10 ліпеня 1931 году.
Пачатак заняткаў з 15 ліпеня
Прыяжджаючыя будуць забясьпечваць інтэрнатам.
Стыпэндыяй у першую чаргу будуць забясьпечаны рабочыя, батракі, беднякі, калгасьнікі і іх дзеці.
Без паведамленьня школы аб прыёме прыезд забараняецца.
Адміністрацыя школы.

Гр-ка Мазік Двэйра Ш